КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 22 (198)
◂ 11 ЧЭРВЕНЯ ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час



**ПРАВОЎ БОЛЬШ НЕ СТАЛА**

Стар. 5

**КВАТЭРА ЁСЦЬ, ЖЫЛЛЯ НЯМА**

Святлана Каласоўская, маладая жанчына з маленькім сынам, вымушана шукаць жытло, хаця і мае ўласную кватэру

Стар. 6

**НАЗАРБАЕЎ СУПРАЦЬ КУЛЬТУ НАЗАРБАЕВА**

Чаму Нурсултан Назарбаеў адмовіўся падпісваць законапраект аб наданні яму тытула Лідэр нацыі. Пра гэта журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з казахскім журналістам Азаматам Нуркадзілавым

Стар. 12

**БЕЛАРУСІСТЫКА ПРАЗ 20 ГАДОЎ**

Стар. 14

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**СВЯТАЯ ЕФРАСІННЯ І ЯЕ СКАРБЫ**

Нарыс Аляксея Хадыкі з цыклу «Таямніцы гісторы»

▸ **ГЕАПАЛІТЫКА**

# КРЫНІЦА СЫРАВІНЫ І СКАНДАЛАЎ

**Вольга ХВОІН**

**Для Беларусі Расія — крыніца. І не толькі энергетычнай сыравіны. Але і міжнародных скандалаў і разборак рознай тэматыкі і ўзроўню. Гэта не скупая на эмоцыі бабулька-Еўропа ці прагматычныя ЗША. З апошнімі размовы ўвогуле кароткія і па справе: няма пераменаў у бок дэмакратыі — санкцыі ды заблакаваныя рахункі. Не весела, адным словам. Іншая справа — Расія...**




З гэтай мілай геаграфічнай ды палітычнай суседкай нашаму кіраўніцтву няма часу сумаваць. Калі з газам ціха, то з-за малака можна паскандаліць ці з-за нафты, Саюз мытны спакою не дае... Неабсяжнае поле для фантазій і дзейнасці, карацей.

Цяпер пачаліся перамовы паміж Расіяй і Беларуссю наконт продажу кантрольнага пакета Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода і беларускай газатранзітнай сістэмы. Натуральна, у вясёленькім рэчышчы. Перамовы запланаваныя да сярэдзіны чэрвеня. І яшчэ напярэдадні кансультацый міністр энергетыкі Расіі Сяргей Шматко ветліва сказаў, што лічыць «цікавымі прапановы Беларусі па «Белтрансгазу» і Мазырскаму НПЗ».

Паводле слоў міністра, Расія гатовая разглядзець прапановы Беларусі наконт перадачы пад расійскі кантроль «Белтрансгаза» і Мазырскага НПЗ, але гэта мусіць вырашацца ў рамках агульнай стратэгіі Адзінай эканамічнай прасторы. Разам з тым, Сяргей Шматко не прамінуў нагадаць, што валоданне кантрольным пакетам акцый «Белтрансгаза» спрэчкам Мінска і Масквы канец не пакладзе, бо ёсць праблема карпаратыўнага кіравання прадпрыемствам. Ды і Мазырскі НПЗ не такі ўжо ласы кавалак — на беларускім рынку з-за высокіх акцызаў няма эфектыўнай сістэмы рознічных продажаў.

Эксперты зазначаюць, што цяпер нафтаперапрацоўчая галіна крыху згубіла сваю прывабнасць для інвестараў: ад пачатку года беларускія НПЗ працуюць у рэжыме няпоўнай загрузкі, заводы выбралі значную частку бязмытавай расійскай нафты з прадугледжаных 6,3 мільёна тон на гэты год. А на сыравіне, якая абкладаецца стандартным мытам, працаваць эфектыўна яны не могуць. Не здольныя НПЗ забяспечыць і высокі выхад светлых нафтапрадуктаў з глыбінёй перапрацоўкі 93 працэнты. Цяпер ён дасягае 70–75 працэнтаў. З рэсурсамі на мадэрнізацыю ў такіх умовах, хутчэй за ўсё, давядзецца пачакаць.

Стасункі Расіі і Беларусі не палягаюць у плоскасці празрыстых эканамічных адносінаў куплі-продажу. Бонусы эканамічныя ды палітычныя — наша ўсё. Кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка, натуральна, заявіў, што «Белтрансгаз» Мінск гатовы прадаць, але ў якасці заахвочвання хай кошт на газ для Беларусі будзе роўны расійскаму. «Вось калі яны скажуць, што будуць па ўнутраных коштах прадаваць газ у Беларусь — на роўных умовах і па ўнутрырасійскіх коштах — мы не супраць, бярыце кантрольны пакет. Гэтак жа і па нафтаперапрацоўчых заводах. Танная нафта — добрыя ўмовы, але не бясплатна», — акрэсліў Лукашэнка ўмовы патэнцыйных здзелак.

І пачалося чарговае міждзяржаўнае шоу, дакладней, частка вялікага і агульнага пад назваю «сяброўства братніх славянскіх народаў». Бо пытанне коштаў на энергасыравіну — яблык разладу ў будаўніцтве Мытнага саюза. Праўда, не факт, што апошні. Пакуль жа афіцыйны Мінск спрабуе скарыстацца гэтым аргументам, асэнсоўваючы, што Расія не зацікаўленая, каб мяжа Мытнага саюза прайшла ўздоўж усходніх абшараў Беларусі.

Праз два тыдні пасля першых пазітыўных ацэнак расійскі бок заняў крыху іншую пазіцыю. Віцэ-прэм'ер РФ Ігар Сечын тонка намякнуў, што тон рэалізацыі праектаў хацела б задаваць Расія. І козыры для гэтага з'явіліся. «У «Газпрама» ўжо ёсць 50 працэнтаў акцый «Белтрансгаза», ён заплаціў за іх 2,5 мільярда долараў. Кошт за кантроль тут вельмі цяжка абмяркоўваць: мы і так за тыя 50 працэнтаў пераплацілі.

Далейшае вырашэнне пытання павінна быць звязана з гарманізацыяй эканамічных мадэляў краін-партнёраў», — патлумачыў віцэ-прэм'ер. Па словах віцэ-прэм'ера РФ Ігара Сечына, набыццё кантрольнага пакету «Белтрансгаза» ў кошт даўгоў павінен вызначаць «Газпрам», хаця набыццё кантролю ў кампаніі, якая мае запазычанасці, і выглядае сумнеўным з эканамічнага боку. Тут, канешне, віцэ-прэм'ер трохі схітрыў: усё ж для Расіі валоданне інфраструктурай, праз якую ажыццяўляецца транзіт сыравіны ў Заходнюю Еўропу, прывабнае.

Трохі канкрэтыкі ў справу дадаў прадстаўнік «Газпрама» Сяргей Купрыянаў, зазначыўшы, што супрацоўніцтва з Беларуссю магчымае толькі з умовай выканання кантрактных абавязальніцтваў і пагашэння доўгу за пастаўкі расійскага газу. «Газпрам» двойчы накіроўваў у «Белтрансгаз» і ўрад Беларусі патрабаванні неадкладна пагасіць назапашаную запазычанасць. Аднак мы так і не атрымалі адказу на простае пытанне: калі будзе сплачаны доўг? Лічым, што нашы беларускія калегі павінны выконваць свае кантрактныя абавязальніцтвы ў поўным аб'ёме, і толькі на гэтай базе можна будзе абмяркоўваць прапановы па далейшым развіцці супрацоўніцтва», — падкрэсліў прадстаўнік холдынгу.

Патлумачым: кантрактны кошт паставак газу ў Беларусь складае 169 долараў за тысячу кубаметраў, аднак Беларусь пакуль плаціць 150 долараў, з-за чаго нарасла запазычанасць, па дадзеных «Газпрама», у памеры каля 200 мільёнаў долараў. Расійскі бок падлічыў, калі Мінск па-ранейшаму будзе аплачваць расійскі газ па кошце 150 долараў за тысячу кубаметраў, то да канца года запазычанасць Беларусі перад Расіяй складзе 1,5 мільярда долараў.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### БРАСЛАЎ. ПАДАРОЖЖА ПА СВЯТЫНЯХ

Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры запрашае ўсіх у сяброўскае падарожжа «Па азёрнаму краю». Яно распачынаецца 20 чэрвеня і пройдзе па маршруце: Пераброддзе (касцёл Сэрца Езуса і Георгіеўская царква кан. XIX — пач. XX стст.), Іказнь (касцёл Божага цела і Мікольская царква кан. XIX — пач. XX стст.), Браслаў (касцёл Раства Панны Марыі XIX ст., Успенская царква кан. XIX ст.), Пеліканы (касцёл Св. Якуба пач. XX ст.), Друсвяты (Петрапаўлаўскі касцёл 20-х гг. XX ст. у закапанскім стылю, Петрапаўлаўская царква кан. XIX ст.), Відзы (Святатроіцкі касцёл пач. XX ст., стараверская царква 20-х гг. XX ст., магіла Тамаша Ваўжэцкага) і інш.

Арганізатары маюць на мэце пазнаёміць удзельнікаў вандроўкі з гісторыяй краю, а таксама прыцягнуць увагу грамадскасці да святыняў, якія неабходна аднаўляць, захоўваць і шанаваць.

### ГЛЫБОКАЕ. ШТУЧНАЯ ЗОНА АДПАЧЫНКУ

На месцы былой пустэчы на ўсходнім беразе возера Кагальнае будзе створана зона адпачынку. На дадзены момант там інтэнсіўна адбываюцца земляныя работы. На месцы невялікага балотца зроблены некалькі штучных сажалак. Пасярэдзіне насыпана круглае па форме ўзвышша, акружанае кальцавым ровам. Адбываецца выраўніванне берагавой лініі возера Кагальнае. Побач будзе ўладкаваная аўтастаянка.

### ВАШУНАВА. ЦВІКІ ВАРТЫЯ ГІСТАРЫЧНЫХ ЭКСПАНАТАЎ

Невядомыя злодзеі абрабавалі этнаграфічны музей «Засцянковая хатка» ў Вашунаве, што пад Параф'янавам. Злодзеі ўзламалі дзверы і вынеслі з памяшкання цвікі, малаткі ды іншыя інструменты. Экспанаты музею зламыснікаў не зацікавілі.

«Засцянковую хатку» стварыў у дзедавай хаце старшыня Таварыства беларускай мовы Віленскага краю Юры Гіль, які памёр летась у Вільні. «Засцянковая хатка» была месцам сустрэчаў, на якія некалькі разоў на год збіраліся родныя сп. Гіля ды прыхільнікі беларушчыны з Вільні ды з розных месцаў Беларусі.

### МЯДЗЕЛ. ТВОРЦЫ ПАЙШЛІ Ў НАРОД

Творчыя сустрэчы з пісьменнікамі Эдуардам Акуліным і Леанідам Дранько-Майсюком адбыліся ў бібліятэках Мядзельскага раёна. Пісьменнікі наведалі Будслаў, Крывічы і Княгінін. Мінулая сустрэча з беларускімі пісьменнікамі ў будслаўскай бібліятэцы адбылася ў 1971 годзе, калі мястэчка наведалі Васіль Быкаў і Ніл Гілевіч.

### ТАЛАЧЫН. НЕЧЫСТОТЫ ЛЮДЗЯМ

Мясцовыя актывісты грамадзянскай кампаніі «Наш Дом» зафільмавалі факт, як у раку Друць асенізатарская машына ЖКГ злівае нечыстоты. Відэадакумент прадстаўлены эколагам. Мясцовае кіраўніцтва маўчыць, бо, мусіць, без яго згоды такое рабіць немагчыма.

КАМПАНІЯ

## ВУЛІЦА ВАСІЛЯ БЫКАВА

**Больш як 46,5 тысячы подпісаў грамадзян сабрана ў Мінску за перайменаванне вуліцы Ульянаўскай у вуліцу імя народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава. Пра гэта паведаміў актывіст грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду!» Міхась Башура.**

Паводле яго слоў, подпісы збіраюцца па кватэрах, а таксама на вуліцах, у скверах і парках сталіцы. Як зазначыў Башура, большасць мінчан станоўча рэагуюць на ініцыятыву перайменавання вуліцы Ульянаўскай. Разам з тым, прадоўжыў ён, зафіксавана некалькі выпадкаў, калі прадстаўнікі міліцыі забіралі ў перапісчыкаў лісты з подпісамі грамадзян, матывуючы гэта тым, што такая дзейнасць забаронена. Апрача таго, падчас затрыманняў і вобыскаў у актывістаў кампаніі, што адбыліся 18 мая, былі канфіскаваны лісты больш чым з 8 тысячамі подпісаў. «Гэтыя подпісы з'яўляюцца грамадскім здабыткам і вынікам волевыяўлення грамадзян. Вось чаму мы будзем патрабаваць ад уладаў вяртання лістоў з гэтымі подпісамі», — сказаў Башура.

Паводле яго слоў, Мінгарвыканкам не задаволіў ніводную з 30 заявак на пікетаванне для збору подпісаў у розных раёнах сталіцы. «І хаця мы звярталіся па дазвол на правядзенне пікетаў у розных месцах, у тым ліку скверах і парках, гарадскія ўлады адмовілі, спасылаючыся на артыкулы закона аб масавых мерапрыемствах, на магчымае чыненне перашкод удзельнікамі пікетаў руху пешаходаў, а таксама дзейнасці розных арганізацый і ўстаноў», — зазначыў Башура.

Як паведаміў актывіст кампаніі «Гавары праўду!» Ігар Ламека, у Гродне за перайменаванне вуліцы Парыжскай камуны ў вуліцу імя Васіля Быкава сабрана больш як 2 тысячы подпісаў.

Збор подпісаў за перайменаванне вуліц праходзіць у Мінску з 9 мая, у Гродне — з 11 мая па ініцыятыве лідэра кампаніі «Гавары праўду!» паэта Уладзіміра Някляева.

Да 22 чэрвеня актывісты кампаніі плануюць завяршыць акцыю і сабраць у Мінску не менш як 50 тысяч, а ў Гродне — не менш за 5 тысяч подпісаў, да 3 ліпеня — падрыхтаваць подпісныя лісты для перадачы ў гарадскія саветы Мінска і Гродна.

**БелаПАН**

ДЫЯЛОГ

## ПАДТРЫМКА АПАЗІЦЫІ

**Фонд імя Конрада Адэнаўэра (ФРГ) падтрымае беларускую апазіцыю на выбарах прэзідэнта. Пра гэта кіраўнік фонду еўрадэпутат Ганс-Герт Пётэрынг заявіў 7 чэрвеня на сустрэчы ў Берліне з маладымі беларускімі кансерватыўнымі палітыкамі.**

Як паведамляе прэс-служба фонду, Пётэрынг заявіў, што праз падтрымку апазіцыі фонд садзейнічае дэмакратызацыі Беларусі. Паводле яго слоў, «дзякуючы падтрымцы дэмакратычных сіл у Беларусі атрымаюць перамогу чалавечая годнасць, дэмакратыя, свабоды».

Кіраўнік фонду Адэнаўэра таксама лічыць важным, каб Еўрапейскі гуманітарны універсітэт, які працуе ў Вільнюсе, атрымаў магчымасць вярнуцца ў Мінск.

Як паведамлялася раней, Пётэрынг наведаў Мінск у лютым 2010 года.

6–11 чэрвеня па запрашэнні кіраўніка фонду Адэнаўэра ў Германіі знаходзіцца група беларускіх маладых палітыкаў. Мэта візіту — дыялог з нямецкімі і еўрапейскімі палітыкамі розных галінаў улады. Праграма прадугледжвае сустрэчы ў МЗС ФРГ, ведамстве федэральнага канцлера, бундэстагу, партыі «Хрысціянска-дэмакратычны саюз», з прадстаўнікамі Маладога саюза Германіі, Аб'яднання хрысціянска-дэмакратычных студэнтаў, а таксама Усходняга камітэта германскай эканомікі.

**БелаПАН**

ПРАВЕРКА

## ЗА ЧЫЙ КОШТ БАНКЕТ?

**Пракуратура Зальцбурга (Аўстрыя) вывучае фінансавыя дакументы пра адпачынак Аляксандра Лукашэнкі ў Альпах у сакавіку 2002 года.**



Як паведаміў аўстрыйскі спартыўны журналіст Эрвін Рот, які правёў расследаванне і перадаў дакументы ў пракуратуру, апошняя разглядае цяпер магчымасць завесці крымінальную справу па падазрэнні ў карупцыі ў дачыненні да экс-кіраўніка Нацыянальнага алімпійскага камітэта Аўстрыі, віцэ-прэзідэнта назіральнага савета сеткі казіно «Casinos Austria» Лео Вальнера і цяперашняга кіраўніка НАК, генеральнага дырэктара гэтай сеткі казіно Карла Штоса.

Раней аўстрыйскія СМІ паведамілі, што ў сакавіку 2002 года Лукашэнка з членамі сям'і і чыноўнікамі адпачываў на горналыжным курорце ў аўстрыйскім Цыролі як кіраўнік Нацыянальнага алімпійскага камітэта па запрашэнні аўстрыйскага калегі, уладальніка сеткі казіно «Casinos Austria» Лео Вальнера. Як выцякае з дзелавых папер, аплата паслуг праходзіла з сакрэтнага рахунка аўстрыйскага НАК, адкрытага па ініцыятыве Вальнера ў «Raiffeisenbank» у 2001 годзе.

У інтэрв'ю аўстрыйскай газеце «Die Presse» Вальнер, у прыватнасці, заявіў, што «дзейнічаў у інтарэсах аўстрыйскай эканомікі», для пашырэння дзелавых кантактаў паміж дзвюма краінамі. Паводле яго слоў, адпачынак Лукашэнкі апладзілі зацікаўленыя ў супрацоўніцтве з Беларуссю аўстрыйскія бізнесмены.

Сярод затрат на агульную суму 200 тысяч еўра — аплата пражывання ў гатэлі, медыцынскія паслугі, аплата горналыжных урокаў для 11 прадстаўнікоў беларускай дэлегацыі, арэнда аўтобуса для 34 чалавек, гульня ў аўстрыйскіх казіно, алкагольныя напоі.

**БелаПАН**

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

## ГЕНЕЗІС НАЦЫІ

**Прэзентацыя кнігі Анатоля Астапенкі «Игде зродилися и ускормлены суть по Бозе. Досвед беларускага нацыяналіста», прысвечаная генезісу беларускай нацыі і беларускага нацыяналізму, адбылася 8 чэрвеня ў Мінску.**

У выданне, напісанае ў жанры гісторыка-філасофскай публіцыстыкі, увайшлі эсэ, знітаваныя беларускай нацыянальнай ідэяй (БНІ). Выданне з'яўляецца першай на беларускай прасторы спробай разгледзець комплекс праблем, звязаных з БНІ на працягу тысячы гадоў існавання Беларусі і беларусаў — ад часоў Полацкага і Тураўскага княстваў да нашых дзён, выявіць гістарычныя постаці дзеячаў палітыкі і культуры, якія зрабілі ўклад у фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі.

Прысутнасць беларускай мовы, нацыянальная свядомасць і любоў да Бацькаўшчыны — вызначальныя рысы падыходу аўтара да БНІ. У яе падмурку, на думку аўтара, ляжыць хрысціянства.

Паводле слоў пісьменніка Васіля Якавенкі, поспех нацыі і яе развіццё — галоўная мэта кожнага этнасу. Але ўсе спробы беларускіх улад знайсці нацыянальную ідэю нічым не завяршыліся, сказаў пісьменнік.

Анатоль Астапенка, які для назвы твору выкарыстаў выраз Францыска Скарыны, адзначыў, што праца над кнігай доўжылася больш за 20 гадоў. «У гэтым выданні адлюстравана маё бачанне нацыянальнай ідэі і нацыяналізму, паміж якімі я стаўлю знак тоеснасці, бо яны адлюстроўваюць усходні і заходні погляды на адно і тое ж паняцце. Я асэнсаванне я імкнуўся ахапіць у гістарычным і культурным ракурсах», — сказаў Астапенка. Сярод сучасных носьбітаў БНІ ў мастацтве ён назваў мастакоў Аляксея Марачкіна і Алеся Пушкіна, скульптара Алеся Шатэрніка.

Пісьменнік Уладзімір Дамашэвіч заявіў, што для масавага чытача трэба зрабіць папулярную версію кнігі значна меншага аб'ёму.

**БелаПАН**

СУД

## ЗНОЎ НЕНАРМАТЫЎНАЯ ЛАЯНКА

**Віцебскі актывіст Кансерватыўна-хрысціянскай партыі — БНФ Сяргей Каваленка пакараны штрафам у памеры 105 тысяч рублёў (3 базавыя велічыні).**

Такое рашэнне прыняў 8 чэрвеня суд Першамайскага раёна Віцебска, паведаміў сустаршыня аргкамітэта па стварэнні партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» Павел Севярынец.

Суд прызнаў Каваленку вінаватым ва ўчыненні дробнага хуліганства. «Інцыдэнт адбыўся 8 мая гэтага года. Сяргея Каваленку і яго брата Віталя затрымалі ў краме. Супрацоўнікі міліцыі абвінавацілі іх у тым, што яны лаяліся», — расказаў Севярынец.

Паводле меркавання Сяргея Каваленкі, міліцыя затрымала іх з братам для таго, каб прадухіліць іх прысутнасць на афіцыйных мерапрыемствах 9 мая з нагоды Дня Перамогі.

Варта зазначыць, што з пачатку 2010 года віцебскі апазіцыянер Сяргей Каваленка неаднаразова затрымліваўся міліцыяй за арганізацыю розных акцый. 14 мая суд Кастрычніцкага раёна Віцебска прыгаварыў яго да трох гадоў пазбаўлення волі ўмоўна за вывешванне бел-чырвона-белага сцяга на галоўнай ёлцы Віцебска 7 студзеня. Гэты ўчынак быў кваліфікаваны ўладамі як «наўмысныя дзеянні, якія груба парушаюць грамадскі парадак і выражаюць яўную непавагу да грамадства».

**БелаПАН**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# «РАЗРУЛІЦЬ» РАСІЮ

Сяргей САЛАЎЁЎ



**Напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі наша кіраўніцтва, здаецца, вырашыла ўпарадкаваць адносіны з Расіяй. У гэтых адносінах мы ўжо дастаткова «завязлі». Гэта тычыцца і мытных пошлін на нафту і аўтамабілі, і нявызначанасць з Мытным саюзам, і ўвогуле шмат пытанняў. І бачна — цягнік беларуска-расійскіх адносінаў, што затармазіў апошнім часам, зварухнецца з «мёртвай кропкі».**

У рамках падрыхтоўкі сустрэчы на найвышэйшым узроўні 7 чэрвеня адбылася тэлефонная размова Аляксандра Лукашэнкі і Дзмітрыя Мядзведзева. Паводле звестак прэс-службы беларускага прэзідэнта, бакі вызначылі «прыкладны пералік пытанняў», які плануецца абмеркаваць на сустрэчы. Чакаецца, што гаворка пойдзе пра функцыянаванне Мытнага саюза і перспектывы стварэння Адзінай эканамічнай прасторы трох краін.

Плануецца абмеркаваць таксама «шэраг іншых актуальных пытанняў парадку дня двухбаковага беларуска-расійскага супрацоўніцтва».

Бакі дамовіліся «даручыць віцэ-прэм'ерам урадаў, якія курыруюць пытанні Мытнага саюза, падрыхтаваць да сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў розныя кампрамісныя варыянты вырашэння праблем, што стрымліваюць эфектыўнае функцыянаванне гэтага саюза і стварэнне АЭП».

«Лідэры Беларусі і Расіі адзіныя ў меркаванні, што сустрэча, якая мае адбыцца, павінна быць максімальна канкрэтнай і выніковай. Яна заклікана стаць важным імпульсам у развіцці інтэграцыйных працэсаў з удзелам нашых краін», — гаворыцца ў паведамленні.

Як інфармуе прэс-служба Крамля, размова адбылася па ініцыятыве беларускага боку. Падчас размовы «была пацверджана дамоўленасць прадоўжыць абмеркаванне пытанняў фармавання Мытнага саюза ў святле рашэнняў, прынятых Расіяй і Казахстанам падчас пасяджэння Вышэйшага органа МС на ўзроўні кіраўнікоў урадаў у Санкт-Пецярбургу 21 мая гэтага года».

Нагадаем, што 21 мая ў Санкт-Пецярбургу кіраўнікі ўрадаў Расіі, Беларусі і Казахстана па выніках шматгадзінных перамоў не змаглі ўрэгуляваць спрэчкі аб набыцці моцы Мытнага кодэкса з 1 ліпеня гэтага года. Прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін адзначыў тады, што рознагалоссі тычыліся аўтамабільнай і авіяцыйнай прамысловасці, мытных пошлін, увозу тавараў фізічнымі асобамі для ўласных патрэб.

Між тым, Беларусь гатова падпісаць адзіны Мытны кодэкс Мытнага саюза Беларусі, Казахстана і Расіі без выключэнняў. Пра гэта заявіў намеснік міністра замежных спраў Беларусі Андрэй Еўдачэнка на 14-м беларуска-польскім эканамічным форуме «Добрасуседства–2010», што праходзіць у Мінску.

Паводле слоў намесніка міністра, Мытны кодэкс, падпісаны 28 мая ў Санкт-Пецярбургу прэм'ер-міністрамі Расіі і Казахстана, — гэта дакумент з выключэннямі. «Беларусь гатова яго таксама падпісаць, але без выключэнняў», — падкрэсліў Еўдачэнка. Намеснік міністра прызнаў, што ў апошні час у Беларусі і Расіі ўзніклі сур'ёзныя рознагалоссі па пытаннях фарміравання Мытнага саюза. «У нас няма адзінай палітыкі па вывазных мытных пошлінах, няма адзінага вывазнога мытнага тарыфу. Больш за тое, нават у Мытным саюзе ўжо пасля 1 ліпеня Расія дапускае далейшыя пошліны ва ўзаемным гандлі трох краін. Мы катэгарычна не згодныя з гэтым пасылам», — заявіў Еўдачэнка.

«Самае галоўнае ў гэтым праекце — што нават у эканамічным саюзе расійскі бок не бачыць магчымасці вырашэння пытанняў па нафце, нафтапрадуктах, газе і іншых сыравінных рэсурсах. Гэта значыць, фактычна і ў Мытным саюзе, і ў Адзінай эканамічнай прасторы расійскі бок выключае энергасектар з інтэграцыі», — падкрэсліў Еўдачэнка.

Магчыма, гэтыя праблемы і «разруляць» прэзідэнты на сустрэчы, якая плануецца неўзабаве? Хутка мы пабачым, чаго дамаглася Расія, а чаго — Беларусь.

Тым часам маскоўскі «Газпрам» прагне ўжо ў дачыненні да Беларусі «гнуць сваю лінію». Сярэднегадавая цана расійскага газу для Беларусі ў 2010 годзе складзе 187 долараў за тысячу кубаметраў, у другім квартале — 184,8 долара. Пра гэта заявіў афіцыйны прадстаўнік «Газпраму» Сяргей Купрыянаў у эфіры «*Эхо Москвы*» 8 чэрвеня.

У першым квартале 2010 года, зазначыў прадстаўнік «Газпраму», цана складала 169 долараў.

Паводле звестак Белстата, у першым квартале 2010 года сярэдняя цана на імпартаваны газ складала 171 долар за тысячу кубаметраў. Аднак, як сцвярджаюць у «Газпраме», Мінск працягвае плаціць за газ па ўзроўні сярэдняй леташняй цаны — 150 долараў за тысячу кубаметраў. У сувязі з гэтым, паводле звестак «Газпраму», доўг «Белтрансгаза» за атрыманы газ на 1 мая склаў 192 мільёна долараў.

Пры гэтым спадзявацца на тое, што «Захад нам дапаможа» не выпадае. Прэзідэнт ЗША Барак Абама працягнуў на год санкцыі ў дачыненні да шэрагу службовых асоб Беларусі. «Дзеянні і палітыка шэрагу членаў урада Беларусі і іншых дзяржаўных чыноўнікаў працягваюць уяўляць экстраардынарную пагрозу нацыянальнай бяспецы і замежнай палітыцы ЗША. З чаго вынікае, што санкцыі ў дачыненні да беларускіх дзяржаўных чыноўнікаў, якія былі прынятыя 16 чэрвеня 2006 года, павінны працягваць дзеянне і пасля 16 чэрвеня 2010 года», — цытуе дакумент прэс-служба Белага дома.

У чэрвені 2006 года прэзідэнт ЗША Джордж Буш падпісаў указ аб фінансавых санкцыях у дачыненні да Аляксандра Лукашэнкі і яшчэ да дзевяці беларускіх службовых асобаў, «адказных за падрыў дэмакратычных працэсаў і інстытутаў, парушэнне правоў чалавека, дзяржаўную карупцыю». Указ блакіруе ўласнасць і правы беларускіх чыноўнікаў на ўласнасць у ЗША, рахункі і магчымасць фінансавых аперацый. Амерыканскім кампаніям і прыватным асобам забаронена заключаць здзелкі з указанымі службовымі асобамі.

У спіс, які прыкладаецца да ўказа, акрамя Аляксандра Лукашэнкі ўвайшлі яго сын Віктар Лукашэнка, намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Наталля Пяткевіч, міністр юстыцыі Віктар Галаванаў, старшыня Белдзяржтэлерадыёкампаніі Аляксандр Зімоўскі, экс-старшыня КДБ Сцяпан Сухарэнка, былы дзяржсакратар Савета бяспекі Віктар Шэйман, экс-камандзір САХР Дзмітрый Паўлічэнка, былы міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў, кіраўнік Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына.

Акрамя таго, у сакавіку 2006 года, пасля выбараў прэзідэнта Беларусі, ЗША далучыліся да спісу неўязных Еўрасаюза і ўвялі забарону на ўезд на сваю тэрыторыю 30 беларускіх чыноўнікаў, у тым ліку прэзідэнта Лукашэнкі.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ



### ЛІЛІЯ АНАНІЧ

Першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч лічыць, што ў Беларусі склалася нацыянальная школа журналістыкі, а краіна мае паўнавартасную медыяпрастору.

«Нацыянальная школа журналістыкі ў Беларусі склалася. Мы маем паўнавартасную нацыянальную інфармацыйную прастору», — заявіла Лілія Ананіч падчас прэс-канферэнцыі, прысвечанай правядзенню V Беларускага міжнароднага медыяфорума «Партнёрства ў імя будучыні».

Па словах чыноўніцы, у Беларусі «канкурэнцыя літаральна ва ўсіх сегментах — як у друкаваным блоку, так і ў электронных СМІ» . Аднак спадарыня Ананіч не сказала, што ў краіне дзейнічае манаполія на электронныя сродкі масавай інфармацыі (хаця і пахвалілася наяўнасцю пяці нацыянальных тэлеканалаў і спадарожнікавым канал «Беларусь-ТБ», які «бачаць ва ўсім свеце»). Не згадала намесніца міністра і аб праблемах, якія маюць недзяржаўныя грамадска-палітычныя выданні: праблемы з распаўсюдам, абмежаваны доступ да інфармацыі, ціск спецслужбаў на журналістаў.

### МІХАІЛ БАРАВЫ



Гендырэктар ЗАТ «Белаўтагаз» прызначаны кіраўніком Федэрацыі водналыжнага спорту Беларусі. Ён быў аднагалосна абраны на справаздачна-выбарным сходзе федэрацыі, якой ад 1992 года кіраваў Віктар Наважылаў.

З 2001 па 2005 год Міхаіл Баравы займаў пасаду міністра транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь і ўзначальваў Федэрацыю веласіпеднага спорту. Новаабраны кіраўнік федэрацыі заявіў, што гатовы ўсяляк развіваць гэты водвішчны від спорту і зрабіць яго адным з самых масавых. Праўда, з веласіпедным спортам у яго так не атрымалася.

Як паведамляе БелаПАН, ЗАТ «Белаўтагаз» займаецца аказаннем паслуг у транспартнай сферы: тэхнічным абслугоўваннем і рамонтам грузавога і легкавога транспарту, міжнароднымі перавозкамі грузаў, рэалізацыяй аўтазапчастак, прылад, змазачных матэрыялаў. У 2007 годзе інтэрнэт-газета «*Ежедневник*» паставіла Баравога на 27-е месца ў спісе ста самых паспяховых і ўплывовых беларускіх бізнесменаў.

### АЛЕКСІЙ ШЫНКЕВІЧ



Архімандрыт Алексій Шынкевіч вызвалены з пасады адказнага прадстаўніка Беларускай праваслаўнай царквы ў справах сувязяў са СМІ за эксцэнтрычнасць ды недастатковую адказнасць перад сабой і Богам. Прынамсі так выглядаюць тлумачэнні мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта з нагоды гучнай адстаўкі святара.

«Пасада, ад якой архімандрыт Алексій вызвалены, выключае ўсялякую эксцэнтрычнасць і прадугледжвае строгую дысцыпліну: знешнюю — то бок у стасунках з вышэйшым кіраўніцтвам і з людзьмі, і ўнутраную — накіраваную на самога сябе, на сваё сумленне і асабістую адказнасць перад Богам», — заявіў мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт у інтэрв'ю «Інтэрфаксу». «Айцец Алексій з цягам часу пачаў успрымаць гэту адказнасць як нейкі карт-бланш, як поўную свабоду ў выказванні сваіх асабістых меркаванняў з вышыні свайго службовага становішча», — патлумачыў прычыну адстаўкі Філарэт.

Аляксей Шынкевіч займаў пасаду адказнага прадстаўніка Беларускай праваслаўнай царквы ў справах сувязяў са СМІ. 25 мая Аляксей заявіў, што Філарэт можа сысці ў адстаўку. А 26 мая ў адстаўку адправілі Шынкевіча.

Летась архімандрыт Алексій выступіў з заявай, што сюжэт, паказны па першым канале аб дзейнасці БХД, з'яўляецца паклёпам і фальшыўкай.

Архімандрыт Алексій (Аляксей Шынкевіч) нарадзіўся ў 1956 годзе ў Беларусі. Скончыў Маскоўскую духоўную акадэмію, працаваў галоўным рэдактарам газеты Беларускага экзархату Рускай праваслаўнай царквы «Царкоўнае слова», прадстаўніком Маскоўскага патрыярха ў горадзе Таронта (Канада). З 2002 года — у Беларускім Экзархаце. У 2005 годзе айцец Алексій быў узнагароджаны прэміяй «За духоўнае адраджэнне».

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# ПА КІМ ЗВОНІЦЬ ЗВОН СУСВЕТНАГА КРЫЗІСУ?

Сяргей НІКАЛЮК



**Насуперак аптымістычным заявам палітыкаў, сусветны крызіс яшчэ толькі пачынаецца, і ў «беларускай эканамічнай мадэлі» практычна няма шанцаў яго перажыць.**

Сын аднаго майго прыяцеля вырашыў летам папрацаваць у ЗША па студэнцкай праграме. Месца яго працы — гасцініца ў адным з гарадкоў на ўзбярэжжы штата Луізіяна. Аднак нечакана ў яго паўсталі праблемы. Іх крыніца размешчана на дне Мексіканскага заліва, у тым самім месцы, дзе кампанія ВР змагаецца з уцечкай нафты з пашкоджанай свідравіны.

Далёка не кожны беларус здольны адшукаць Мексіканскі заліў на карце, тым не менш падзеі, што там адбываюцца, уплываюць на жыццёвыя планы нашых грамадзян. Глабалізацыя, аднак. Такімі словамі пракаментаваў бы праблему беларускага студэнта карэнны жыхар Чукоткі і, як заўсёды, меў бы рацыю.

З падзеямі, спароджанымі глабалізацыяй, мы сутыкаемся практычна штодня. Самы яркі прыклад — праблемы беларускай экономікі і сусветны крызіс. І без падказкі афіцыйнай прапаганды большасці абывацеляў была зразумелая прычынна-выніковая сувязь паміж імі. Крызіс — прычына. Праблемы — вынік. З гэтым не паспрачаешся, але калі сусветны крызіс прытармазіў рост беларускай экономікі, то што ж тады яго паскорыла ў канцы 2003 года?

## Ад аднаўленчага росту да афшорнага

Звернемся да табліцы. У год першых прэзідэнцкіх выбараў падзенне ВУП было максімальным. Нядзіўна, што народ узбунтаваўся і падтрымаў харызматычнага кандыдата, які паабяцаў «запусціць заводы». Сваё слова ён стрымаў, і ўжо ў 1996 годзе статыстыка зафіксавала рост ВУП. Вынік наступнага года пераўзышоў чаканні самых адчайных аптымістаў. Але развіць поспех не атрымалася, і з 1998 года «беларуская эканамічная мадэль» пачала буксаваць.

Кароткатэрміновы ўсплёск эканамічнага росту ў другой палове 90-х гадоў назіраўся ў большасці былых савецкіх рэспублік, незалежна ад эканамічнай палітыкі, якую праводзілі ўлады. Эканамісты называюць такі рост «аднаўленчым». У адрозненне ад росту інвестыцыйнага, што мае патрэбу ва ўкараненні новых тэхналогій, аднаўленчы рост абапіраецца на актыўнае ўцягванне ў вытворчасць незадзейнічаных у перыяд крызісу магутнасцяў.

Да пачатку «нулявых» гадоў рэсурсы аднаўленчага росту ў Беларусі былі цалкам вычарпаныя. Рост рэальных прыбыткаў спыніўся, рэйтынг спецыяліста па запуску заводаў папоўз уніз. Здавалася, яшчэ трохі — і ўлада зноў «апынецца ў брудзе», але рымэйк сітуацыі 1994 года не адбыўся. На сусветных рынках цэны на нафту пайшлі ўверх. Лішак нафтадолараў згенераваў у Расіі попыт на беларускія тавары, а бязмытная расійская нафта дазволіла запусціць «нафтавы афшор».

Такім чынам, сваім палітычным даўгалеццем Лукашэнка шмат у чым абавязаны росту цэн на нафту. Але чаму яны пачалі расці? Без адказу на гэта пытанне нам будзе цяжка зразумець мінулае, сучаснасць і будучыню «беларускай эканамічнай мадэлі», а заадно і яе архітэктара.

## Амерыканскі дысбаланс

Сусветны крызіс заняў першыя радкі на стужках інфармацыйных агенцтваў пасля банкруцтва банка «Lehman Brothers» (верасень 2008 года), але, што цікава, прычыны крызісу апынуліся на перыферыі грамадскай увагі. Веды, на жаль, спараджаюць смутак, а няведанне — аптымізм. Апошні надзвычай важны для палітыкаў. Яны навыперадкі кінуліся шукаць «зялёныя парасткі» (выраз старшыні Федэральнай рэзервовай сістэмы ЗША Бена Бернанке), якія б сігналізавалі пра аднаўленне прамысловага росту. Хто шукае, той заўсёды знойдзе. Таму афіцыйныя заявы з нагоды заканчэння сусветнага крызісу паступаюць з перыядычнасцю марскіх прыліваў.

Калі мы паглядзім на графік сярэдняй заработнай платы ЗША **ў супастаўных цэнах**, дык выявім, што яе бурны рост пасля заканчэння другой сусветнай вайны змяніўся ў 1972 годзе падзеннем. Пасля 1980 года рост аднавіўся, але тэмп яго апынуўся вельмі далёкім ад папярэдняга перыяду. Думаю, шмат хто з чытачоў будзе здзіўлены, аднак сярэдняя заработная плата ў ЗША сёння не нашмат вышэй, чым у далёкім 1972-м!

На думку асобных эканамістаў, да пачатку 70-х гадоў мінулага стагоддзя эканамічнае развіццё, заснаванае на мадэлі навукова-тэхнічнага прагрэсу, сябе вычарпала. Разбіраць дэталёва іх аргументы ў газетным артыкуле няма магчымасці, таму абмяжуюся толькі згадваннем двух фактаў. Па-першае, у 1971 годзе ЗША абвясцілі дэфолт па долары, калі перасталі прывязваць яго да золата. З тых часоў адзінай мерай кошту ў свеце з'яўляецца долар, не забяспечаны нічым. Па-другое, у найбуйнейшай экономіцы свету пачалася стагфляцыя (падзенне вытворчасці пры высокай інфляцыі), што не магло быць растлумачана ў рамках класічнай эканамічнай тэорыі.

Праблему стагфляцыі атрымалася вырашыць з дапамогай «рэйганомікі», сутнасць якой складалася ў грашовай напампоўцы за кошт эмісійных долараў, толькі накіроўваліся яны не на падтрымку бізнесу, а на крэдытнае стымуляванне канчатковага попыту — як дзяржаўнага, так і прыватнага (адсюль рост узроўню жыцця). Для абмежавання інфляцыі ў сектары спажывання стаўкі па крэдытах былі паднятыя да нябачанага раней узроўню (уліковая стаўка ФРС у 1981 годзе склала амаль 20%). Залішнюю ж ліквіднасць давялося «ўтылізаваць» за кошт раздзімання фінансавых бурбалак.

| ЗМЯНЕННЕ ВУП У БЕЛАРУСІ Ў ПРАЦЭНТАХ ДА ПАПЯРЭДНЯГА ГОДА | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 94 | 95 | 96 | 97 | 98 | 99 | 00 | 01 | 02 | 03 | 04 | 05 | 06 | 07 | 08 | 09 |
| 86 | 90 | 103 | 111 | 108 | 103 | 106 | 105 | 105 | 107 | 111 | 109 | 110 | 109 | 110 | 100 |



Сярэдняя заработная плата ў ЗША ў супастаўных адзінках (1947=100)

Вынікам «рэйганомікі», якая паслядоўна ажыццяўлялася на працягу 30 гадоў, стаў гіганцкі дысбаланс паміж узроўнямі вытворчасці і спажывання. Амерыканцы, якія вырабляюць 20 працэнтаў сусветнага ВУП, ухітраюцца спажываць 35 працэнтаў агульнасусветнага пірага. Пад залішняе спажыванне ў свеце створаныя адпаведныя вытворчыя магутнасці, і зараз, калі попыт у ЗША пачаў падаць, гэтыя магутнасці вызваляюцца.

У якасці асноўнай крыніцы эканамічнага росту ў свеце ў апошнія гады выступаў амерыканскі попыт. Экономікі іншых краін раслі або за кошт абслугоўвання амерыканскага попыту, або за кошт абслугоўвання тых, хто абслугоўваў амерыканскі попыт. У ліку апошніх краін знаходзіцца і Беларусь.

## Кітайскія тавары за кітайскія грошы

Масла ў агонь амерыканскіх праблем падліў і Кітай — дакладней, падлілі яго самі амерыканцы, калі масава пачалі пераводзіць прадпрыемствы бліжэй да танных працоўных рук. Навошта плаціць *сваім* 15 долараў у гадзіну, калі можна заплаціць *чужым* 50 цэнтаў. У выніку даражэйшыя працоўныя месцы ў амерыканскай прамысловасці сталі замяшчацца таннымі ў сферы паслуг, што таксама стрымлівае рост зарплаты.

Але адным фактарам танных рук роля Кітая ў лёсе сучаснай Амерыкі сёння не абмяжоўваецца. Сярэднестатыстычны кітаец 40 «капеек» з кожнага зробленага ім юаня адкладае на чорны дзень. Сярэднестатыстычны амерыканец з кожнага «зялёнага» не адкладае ні цэнта. Ён, як адзначалася вышэй, жыве ў пазыку. На кожнай амерыканскай хатняй гаспадарцы сёння вісіць фінансавая гіра, роўная 130 працэнтам гадавога прыбытку (сярэднестатыстычны беларус адкладае каля 5 капеек з рубля).

Нягледзячы на тое, што, паводле Лукашэнкі, «*опыт Китая и опыт Беларуси весьма близки друг другу, они перспективны и успешно реализуются на практике*», кітайскія таварышы не бяруць на сябе абавязанняў па сацыяльнай падтрымцы насельніцтва, хоць і рэгулярна праводзяць Усекітайскія сходы народных прадстаўнікоў. Такая палітыка не дазваляе кітайцам у масавым парадку фармаваць «пачуццё ўпэўненасці ў заўтрашнім дні». Вось і даводзіцца гаротнікам эканоміць і цяжка працаваць, цяжка працаваць і эканоміць.

Але вернемся да 40 «капеек» з кожнага зробленага юаня. Яны збіраюцца ў гіганцкую суму, пераварыць якую кітайская экономіка не ў стане. На «лішкі» Кітай набывае амерыканскія казначэйскія абавязанні, што дазваляе амерыканцам не проста купляць кітайскія тавары, але купляць іх за кітайскія грошы.

## У зачараваным коле

Апісаны механізм падвышэння жыццёвага ўзроўню патрабуе сталага павелічэння аб'ёму крэдытавання. Але як гэтага дамагчыся, калі прыбыткі пазыкадаўцаў не растуць, а таму ўвесь час узнікаюць праблемы з абслугоўваннем раней узятых крэдытаў. Выхад з гэтага становішча быў знойдзены ў перакрэдытаванні пазыкаў, зрабіць тое можна толькі пры ўмове стабільнага паніжэння кошту крэдытаў, да чаго і вымушаная была прыступіць ФРС. На мяжы 2003–2004 гадоў уліковая стаўка апусцілася практычна да нуля, і тым самым заблакавала магчымасці наступнага перакрэдытавання. Эпоха жыцця ў крэдыт, эпоха «рэйганомікі» завяршылася. Пачаліся масавыя банкруцтвы хатніх гаспадарак на фоне попыту, які сціскаўся.

Аб'ём міжнароднага гандлю таварамі ў 2009 годзе скараціўся на 12 працэнтаў (у коштавым вымярэнні — на 23 працэнты). У апошні раз такое было ў Вялікую Дэпрэсію. Каля 3 мільёнаў амерыканскіх домаўладальнікаў страцілі права на выкуп закладной. Для прадухілення калапсу было прынята рашэнне заліць пажар крызісу грашыма. Толькі за мінулы год для падтрымкі попыту, паводле дадзеных агенцтва «Блумберг», было выдаткавана 7,8 трыльёна долараў (з улікам інфляцыі на план Маршала — 115 мільярдаў, на «новы курс» Рузвельта — 500 мільярдаў).

Такія сур'ёзныя сумы не прывялі да павелічэння агульнанацыянальнага крэдытнага партфеля. Хатнія гаспадаркі не спяшаюцца браць падаражэлыя крэдыты, а карпарацыям, па вялікім рахунку, укладваць няма куды. У выніку асноўная маса грошай марнуецца на надзіманне чарговых фінансавых бурбалак, але гэтым разам не на рынку нерухомасці, а на рынку сыравіны (адсюль высокія кошты на нафту).

Страты прамысловых карпарацый і банкаў для прадухілення «эфекту даміно» ўсё часцей вымушаны браць на сябе дзяржавы. Аднак гэта азначае, што крызіс адкладваецца на пэўны час. Бо перад пагрозай банкруцтва могуць апынуцца самі дзяржавы, што ўжо і адбываецца ў Еўропе. Спробы ж адмовіцца ад эмісійнай падтрымкі экономікі і перайсці да палітыкі скарачэння бюджэтных выдаткаў прывядуць да чарговага сціскання попыту.

Атрымліваецца зачараванае кола, выхад з якога ў рамках існай мадэлі эканамічнага росту не праглядаецца. Крызіс урэшце скончыцца. Якім будзе свет пасля яго — сказаць цяжка, але ў тым, што ён істотна зменіцца — сумневаў не ўзнікае. Няшмат шанцаў перажыць крызіс і ў «беларускай эканамічнай мадэлі», яна і да крызісу падтрымлівалася на плаву толькі дзякуючы вонкавым датацыям, ільвіная частка якіх ішла на падкуп электарату.

ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ

# ПРАВОЎ БОЛЬШ НЕ СТАЛА

Генадзь КЕСНЕР

**Нягледзячы на шматлікія заявы беларускага кіраўніцтва пра лібералізацыю і дэмакратызацыю ў краіне, сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі не толькі не паляпшаецца, але ў чымсьці робіцца нават горшай. Пра гэта 8 чэрвеня журналістам заявілі беларускія праваабаронцы, якія акрэслілі становішча з выкананнем правоў чалавека ў Беларусі за першыя шэсць месяцаў бягучага года.**



Валянцін Стэфановіч і Алег Гулак

Як адзначыў прадстаўнік незарэгістраванага Праваабарончага цэнтру «Вясна» Валянцін Стэфановіч, у першым паўгоддзі 2010 года ніякіх пазітыўных перамен, датычных выканання правоў чалавека, у Беларусі не назіралася, у тым ліку і ў заканадаўстве, якое рэгулюе грамадзянскія і палітычныя правы. Выключэннем сталі хіба што змены ў выбарчым заканадаўстве, якія, тым не менш, практычна ніяк не паўплывалі на практыку правядзення апошніх выбараў у мясцовыя саветы дэпутатаў, у выніку чаго гэтыя выбары не былі прызнаны празрыстымі і дэмакратычнымі.

Па словах Стэфановіча, пазітыўным момантам можна назваць і тое, што «зверху» паступіла ўказанне прыняць закон аб альтэрнатыўнай службе. Як следства — часткова прыпынілася практыка прыцягнення да крымінальнай адказнасці асоб, што адмаўляюцца служыць у войску па рэлігійных ці іншых перакананнях.

Валянцін Стэфановіч канстатаваў, што ў Беларусі працягваецца крымінальны пераслед грамадзян па палітычных матывах. «Назіраецца адмоўная дынаміка сітуацыі з правамі чалавека, нашу асаблівую занепакоенасць выклікаюць падзеі апошніх месяцаў. Не стала выключэннем практыка крымінальнага пераследу па палітычных матывах, напрыклад, справа Алега Сургана, які стаў ахвярай катаванняў з боку супрацоўнікаў міліцыі і якога пазней абвінавацілі ў тым, што ён укусіў міліцыянта за палец, лежачы на падлозе міліцэйскай машыны… Сутнасць справы ў гэтай сітуацыі вельмі падобная на справу Сяргея Парсюкевіча… Гэта і справа Сяргея Каваленкі, якога абвінавацілі ў хуліганскіх дзеяннях за тое, што ён вывесіў бел-чырвона-белы сцяг на навагодняй елцы», — сказаў прадстаўнік «Вясны».

Асобна праваабаронцы закранулі судовы працэс над былымі ваўкавыскімі прадпрымальнікамі Мікалаем Аўтуховічам і Уладзімірам Асіпенкам. «Гэты судовы працэс прайшоў з сур'ёзнымі працэсуальнымі парушэннямі, якія звязаны з палітычнымі матывамі ўладаў, пра што сведчыць надпіс на адным з дакументаў, што справа знаходзіцца на асабістым кантролі ў прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Гэта адпавядае паняццю «палітычны вязень», якое сфармулявана Радай Еўропы», — адзначыў юрыст.

Па інфармацыі, якой валодае праваабаронца, зараз адвакат Мікалая Аўтуховіча знаёміцца з пратаколам судовага пасяджэння. «Прысуд Вярхоўнага Суда ўступае ў сілу адразу пасля яго вынясення. Мы шмат крытыкавалі тое, што Вярхоўны Суд у першай інстанцыі разглядае гэту справу, таму што абвінавачаны пазбаўляецца яшчэ адной судовай інстанцыі, якая б магла правесці праверку законнасці вынесенага судовага рашэння. Касацыйнай інстанцыі ў Вярхоўным Судзе няма, ёсць толькі скарга па парадку нагляду за законнасцю судовага рашэння, якая падаецца на імя старшыні ВС, і, наколькі я ведаю, зараз такія скаргі на імя старшыні ВС рыхтуюцца, — паведаміў Валянцін Стэфановіч. — Што тычыцца

**Афіцыйны Мінск шмат гадоў ігнараваў свой абавязак рабіць справаздачу перад Камітэтам па правах чалавека ААН пра выкананне сваіх міжнародных абавязацельстваў**

прымеркаванай да 9 мая, Дня Перамогі, амністыі, закон аб якой быў прыняты ў другім чытанні, дык адносна Аўтуховіча, па меркаванню адвоката, казаць, што на яго распаўсюджваецца гэтая амністыя, не выпадае, паколькі ва ўсіх законах аб амністыі (і гэтая — не выключэнне) заўсёды ёсць фармулёўка, што на асобаў, якія парушылі парадак адбыцця пакарання, парадак амністыі не распаўсюджваецца. Фармальна атрымліваецца, што Аўтуховіч здзейсніў злачынства падчас адбыцця папярэдняга пакарання… Можа так стацца, што Аўтуховіч зможа разлічваць толькі на ўмоўна-датэрміновае вызваленне. Што датычыцца іншых абвінавачаных: Асіпенкі, Казлова і Ларына, то, напэўна, на іх амністыя будзе распаўсюджана».

Асаблівую заклапочанасць праваабаронцаў выклікае працяг практыкі выканання ў Беларусі смяротных прысудаў. Маецца на ўвазе расстрэл у сакавіку бягучага года Андрэя Жука і Васіля Язэпчука насуперак працэдуры ААН № 92, якая была распачата Камітэтам па правах чалавека Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і пра якую было паведамлена беларускаму ўраду. «Гэта прыкры факт, што Беларусь папросту дэманстратыўна ігнаруе свае міжнародныя абавязацельствы, якія яна на сябе ўзяла, прызнаўшы кампетэнцыю Камітэта па правах чалавека ААН», — заявіў Валянцін Стэфановіч. Ён нагадаў, што зусім нядаўна Гродзенскі абласны суд вынес яшчэ два смяротныя прысуды, якія зараз у касацыйным парадку абскарджваюцца ў Вярхоўным Судзе Беларусі.

Праваабаронца таксама звярнуў увагу на тое, што ў краіне можа вярнуцца практыка прымянення артыкула 193 прым. Крымінальнага кодэкса за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Удзельнікі прэс-канферэнцыі звярнулі ўвагу на тое, што ў апошнія месяцы ва ўладных структурах больш не вядуцца размовы ні пра ўвядзенне мараторыя на смяротнае пакаранне, ні пра адмену артыкула 193 прым. Крымінальнага кодэкса.

Па словах старшыні РПГА «Беларускі Хельсінскі камітэт» Алега Гулака, адным з інструментаў паляпшэння сітуацыі з правамі чалавека ў краіне з'яўляецца выкарыстанне міжнародных механізмаў абароны гэтых правоў. «На жаль, беларускія ўлады не маюць звычкі слухаць праваабаронцаў і карыстацца іхнымі парадамі», — сказаў кіраўнік БХК.

«Мы жывем у становішчы і ў той час, калі сітуацыя з правамі чалавека вельмі моцна палітызаваная. З аднаго боку, тое вельмі добра, бо гэта гаворыць, што правы чалавека сёння — сур'ёзны, неад'емны чыннік міжнароднай палітыкі. З іншага — палітызаванасць замінае вырашаць гэтыя праблемы, таму што ўлады бачаць у гэтым пагрозу свайму захаванню, і такім чынам гэта сістэма мяняецца не так хутка, як нам таго хацелася б», — адзначыў старшыня Беларускага Хельсінскага камітэта.

Падчас прэс-канферэнцыі праваабаронцы таксама паведамілі, што прадставілі Камітэту па правах чалавека Арганізацыі Аб'яднаных Нацый Альтэрнатыўны даклад беларускіх НДА пра выкананне Беларуссю Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах. Як адзначыў Валянцін Стэфановіч, афіцыйны Мінск шмат гадоў ігнараваў свой абавязак рабіць справаздачу перад Камітэтам па правах чалавека ААН пра выкананне сваіх міжнародных абавязацельстваў. Такая справаздача мусіць рыхтавацца кожныя чатыры гады, але Беларусь апошні раз рабіла гэта ў далёкім 1997 годзе.

«Мы гатовы дапамагаць нашай краіне мець добры выгляд у плане правоў чалавека, калі краіна гэтага хоча. Калі ўлады забыліся пра свае абавязкі, мы ім будзем пра гэта нагадваць», — заявіў старшыня БХК Алег Гулак і паведаміў, што ўвосень 2010 года ў Вільні адбудзецца з'езд беларускіх праваабаронцаў.

ПАРТНЁРСТВА

# МЛЯВАЯ ДЫНАМІКА

**Прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, якія працуюць у Беларусі, пазітыўна ацэньваюць дынаміку ўдзелу Беларусі ў праграме «Усходняе партнёрства», аднак адзначаюць, што працэс супрацоўніцтва мог бы развівацца больш хуткімі тэмпамі, калі б на тое была палітычная воля беларускіх уладаў.**

## Трыванне і яшчэ раз трыванне

«У гэтым пытанні ёсць нагода для аптымізму. Усё ж ініцыятыва «Усходняе партнёрства» — на перспектыву, і не варта чакаць, што за год адбудуцца радыкальныя змены. Думаю, трэба мець трыванне — і вынік будзе», — выказаў сваё меркаванне адносна беларуска-еўрапейскага супрацоўніцтва пасол Швецыі ў Беларусі Стэфан Эрыксан падчас сустрэчы з журналістамі. Таксама ён сказаў, што адкрыццё ў Мінску паўнавартаснага прадстаўніцтва Еўрапейскай камісіі дазволіла б паскорыць развіццё адносінаў з Еўрасаюзам.

Што тычыцца супрацы Беларусі і Швецыі, то з шэрагу апошніх дасягненняў — падпісанне «рамачнага пагаднення» паміж Беларуссю і Паўночным інвестыцыйным банкам (NIB). Гэта пагадненне дае магчымасць банку даваць крэдыты на праекты па ахове навакольнага асяроддзя ў Беларусі. Прыярытэт будзе аддавацца праектам па ачыстцы вады ў такіх гарадах, як Брэст, Гродна і Віцебск, бо Беларусь часткова ўваходзіць у балтыйскі водны басейн. Экалагічнае супрацоўніцтва Паўночнага інвестыцыйнага банка будзе скаардынавана з іншымі агенцтвамі, якія аказваюць міжнародную дапамогу.

Паўночны інвестыцыйны банк — міжнародная фінансавая ўстанова васьмі скандынаўскіх і Балтыйскіх краін. Ён забяспечвае доўгатэрміновае фінансаванне праектаў у галіне энергетыкі, экалогіі, транспарту, лагістыкі і камунікацыі ды праекты, якія ўзмацняюць канкурэнтаздольнасць тавараў і павляпшаюць навакольнае асяроддзе. Банк мае ацэнку крэдытаздольнасці — ААА/ааа.

## Жаданні і ўмовы Мінска

Супрацоўнік па палітычных пытаннях, другі сакратар Прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі Рамунас Янушаўскас сказаў, што ўлады Беларусі часта пытаюцца наконт магчымасцяў фінансавання Беларусі ў межах «Усходняга партнёрства». Але мы падкрэсліваем, што «Усходняе партнёрства» — гэта найперш магчымасць наблізіцца краінам-удзельніцам праграмы да ЕС на сацыяльным узроўні, — падкрэслівае дыпламат. — Грошы маюць дапаможную ролю. Сродкі, якія былі выдзеленыя для Беларусі, прызначаныя для рэалізацыі ініцыятыў высокага ўзроўню, а таксама для правядзення працы, сустрэчаў, якія запланаваныя па чатырох панэлях праграмы».

Рамунас Янушаўскас зазначыў, што працягваюцца перамовы адносна складу беларускай дэлегацыі ў працы Парламенцкай асамблеі «Усходняга партнёрства» (Еўранэст). Нагадаем, што Беларусь адмовілася ад кампраміснага варыянту па складу дэлегацыі: па пяць прадстаўнікоў парламента і апазіцыі. «Не буду забягаць наперад. Мы спадзяемся, што гэты форум рана ці позна адбудзецца, і што ён будзе садзейнічаць супрацоўніцтву краін-партнёраў», — зазначыў спадар Янушаўскас.

Дыпламат лічыць, што афіцыйны Мінск, калі падпісваўся пад стартавым дакументам праграмы, заявіў пра сваю гатоўнасць выконваць пэўныя абавязкі. «Але мы хацелі б, каб Беларусь удзельнічала не толькі ў шматбаковым фармаце супрацы, але і двухбаковым, які з'яўляецца асноўным, — падкрэслівае другі сакратар Прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі. — Гэта дасць магчымасці для свабоднага гандлю, свабоднага перамяшчэння людзей і гэтак далей. Але трэба, каб у нас было агульнае разуменне, чаго мы хочам, і агульныя каштоўнасці, то бок свабода і дэмакратыя ў розных яе праявах. І, канешне, мы хочам бачыць больш крокаў у бок адкрыцця эканомікі і рыначных рэформаў у Беларусі, што будзе садзейнічаць устойліваму развіццю дзяржавы ў доўгатэрміновым плане».

Нагадаем, што Беларусь не мае падпісанага з Еўрапейскім саюзам Пагаднення аб партнёрстве і супрацоўніцтве, якое дазваляе паўнавартасна рэалізоўваць палітыку двухбаковага і шматбаковага ўзаемадзеяння.

ЖЫЦЦЁ

# КВАТЭРА ЁСЦЬ, ЖЫЛЛЯ НЯМА

Лола БУРЫЕВА

**Святлана Каласоўская, маладая жанчына з маленькім сынам, вымушана шукаць жытло, хаця і мае ўласную кватэру. І гэта нягледзячы на тое, што побач з гэтай трохпакаёўкаў — дзіцячы садок, праца ды жывуць сваякі.**



Калі заходзіш у кватэру Святланы, з'яўляецца адчуванне, што скура стала ліпкай, вопратка — вільготнай, цяжкай і няўтульнай. Вітае задушлівы пах волкасці, сцены пакрытыя чорнай і белай цвіллю. Шпалеры паадставалі ад сцен. Мэбля ў хаце расстаўленая хаатычна — так жанчына хавае самыя страшныя месцы, такія, як чорны кут за шафай. На стыках столі і сцен — белы мох. На шпалерах і пад імі — чорная цвіль. Калі глядзіш на аконныя рамы, здаецца, што хтосьці абшмараваў іх тоўстым пластом бруду. Але гэта не бруд, а грыбок. Змагацца з празмернай вільгаццю касметычнымі метадамі не выпадае — капітальны рамонт патрэбны і кватэры, і дому.

## Басейн на даху

У 1991 годзе маці Ала Аляксандраўна Святланы атрымала дзве кватэры ў новым доме № 28 на вуліцы Геафізіка ў мястэчку Калодзішчы пад Мінскам. Дзве, таму што сям'я шматдзетная — у Святланы дзве сястры і два браты. Старэйшым дзецям маці аддала кватэру на першым паверсе. А сама, са Святланай і яе малодшым братам Сашам пасяліліся на чацвёртым, апошнім паверсе.

Калі сям'я перабралася ў новы дом, Святлане было шэсць гадоў. Праблемы пачаліся адразу ж пасля засялення. Дах у новым доме быў зроблены так, быццам бы архітэктар планаваў там басейн — высокія барты зрабілі яго рэзервуарам для збору вады і снегу, а вадасцёкаў увогуле не запланавалі. Апроч таго, пакрыццё даху было зроблена дрэнна — стыкі не заладжаныя як след, вада праходзіць пад рубероід, і далей — у кватэру.

Самым яркім дзіцячым уражаннем Святланы ад новай кватэры былі «струменьчыкі вады са столі, якія сцякалі ў расстаўленыя паўсюль тазікі і вёдры; волкая коўдра, ад цяжару якой раніцай ламіла ўсё цела; і вада, якая расцякаецца па люстэрку ў мамчыным пакоі». Рамонт даводзілася рабіць раз у паўгода, каб хоць неяк выратавацца ад грыбка. Шпалеры прыбівалі цвікамі, бо з-за вільготнасці яны не трымаліся на сцяне.

Многія гады Святлана і яе брат жылі ў такіх умовах. У выніку ў абодвух з'явіліся сур'ёзныя праблемы са здароўем. У жанчыны — хранічны бранхіт. Саша ўвесь час хварэе. Маленькі Кірыл, сын Святланы, таксама жыў у гэтай кватэры ад нараджэння і да чатырох гадкоў. У яго — падазрэнне на сухоты. І гэта не дзіўна. Бо медыкамі даўно даказана, што ўдыхаць паветра, якое ўтрымлівае споры цвілі, вельмі небяспечна. Гэта можа прывесці да алергіі, лёгачных захворванняў, астмы, паслаблення імунітэту ў цэлым. Калі Святлана паказвае медыцынскую картку Кірыла, колькасць дыягназаў «бранхіт» у ёй палохае.

## Скаргі — у спадчыну

Некалькі разоў маці Святланы пісала скаргі ў ЖЭС, але, не атрымаўшы выніку, адступілася... Пасталеўшы, за гэта ўзялася сама Святлана. Стымулам для барацьбы за чалавечыя ўмовы жыцця стала і нараджэнне сына. Яна пачала пісаць скаргі ў ЖЭС па месцы жыхарства. У 2005 годзе яна дамагласся праверкі, у выніку было прынятае рашэнне, што дах неабходна рамантаваць. Рашэнне было, а рамонт — не.

Летась, калі сям'я страціла надзею атрымаць дапамогу ад ЖЭСа, яна звярнулася ў ЖКУ № 2 у Бараўлянах (за ім замацаваны ЖЭС Святланы). Дапамогі адтуль таксама не было.

Наступнай інстанцыяй, куды звярнулася Святлана, стаў Мінгарвыканкам. Спачатку жанчыну папросту не хацелі слухаць. Маўляў, такімі пытаннямі павінен займацца ЖЭС. Але потым пашкадавалі маладую маму, якая да таго ж засталася без бацькоў — мама і тата Святланы памерлі ў 2008 годзе, і прынялі заяву.

У снежні 2009 года камісія зноў праверыла ўмовы жыцця ў доме, і, як і ў 2005-м, было прынята рашэнне адрамантаваць дах. Але рамонт ніхто нават не пачынаў.

Дзевятнаццаць гадоў блукання па дзяржустановах не прынеслі ніякіх вынікаў. І Святлана вырашыла, што разабрацца з кватэрным пытаннем з дапамогай дзяржавы ў яе не атрымаецца. Але і жыць у цвілой кватэры жанчына з маленькім сынам больш не хацела ды і не магла. У 2008 годзе яна з'ехала разам з сынам на здымную кватэру.

Тут трэба згадаць, што Саша — брат Святланы, якому зараз 23 гады, амаль заўсёды беспрацоўны, і за кватэру не плаціць. Гэта значыць, пераехаўшы ў здымнае жыллё, жанчыне даводзіцца плаціць і за кватэру ў Калодзішчах. Каб хоць неяк зэканоміць, Святлана спрабавала знайсці жыхароў у пустуючыя пакоі ў каладзішчанскай кватэры. Яна прапанавала мінімальны кошт, бо, разумела, што жыць у волкасці і цвілі за вялікія грошы ніхто не захоча. Але нават за смешны кошт адважных жыльцоў знаходзіцца мала, ды і тыя вытрымліваюць нядоўга.

## Шукаюцца аматары цвілі і вільгаці

Святлана вырашыла размяняць сваю трохпакаёўку на дзве аднапакаёвыя. Адну пакінуць сабе з сынам. А другую аддаць брату. Аднак высветлілася, што яе кватэра не прыватызаваная. А значыць, прадаць яе нельга. І Святлана зноў пайшла ў ЖКУ №2. Намеснік начальніка ЖКУ Сяргей Данілайла растлумачыў ёй, што нічым дапамагчы не зможа, бо вырашэнне такіх пытанняў не ў кампетэнцыі ЖКУ. Ён прапанаваў звярнуцца ў рыэлтарскую кантору. Калі Святлана ўдакладніла, што чакае дапамогі ад ЖКУ, Сяргей Міхайлавіч параіў звярнуцца да начальніка жыллёвага аддзела ў мястэчку Гатава, Наталлі Герасіменкі. (Патлумачым, што ЖЭС у Калодзішчах падпарадкоўваецца ЖКУ ў Бараўлянах, які, у сваю чаргу, падпарадкоўваецца ЖКУ ў мястэчку Гатава).

Наталля Герасіменка таксама сказала, што нічым не можа дапамагчы. Яна растлумачыла, што магчымая толькі аперацыя куплі-продажы. А такія пытанні вырашаюць рыэлтары, а не працаўнікі жыллёвай камунальнай гаспадаркі. Начальнік жыллёвага аддзела сказала, што ЖКГ не мае права даць кватэру наўзамен «зацвілай», бо яны не ўласнікі жылля, ЖКГ толькі абслугоўвае дамы.

Каб прадаць кватэру, яе трэба спачатку прыватызаваць, а гэта можа каштаваць некалькі дзесяткаў мільёнаў беларускіх рублёў. Хацелася б скончыць аповед на гэтым месцы. Напісаць некалькі апошніх радкоў пра тое, як жанчына лёгка прыватызавала сваю кватэру, потым прадала яе і купіла новую — сухую і светлую. Але ўсе мы добра разумеем, што ў маладой мамы, без мужа і бацькоў, няма некалькіх лішніх мільёнаў, каб заплаціць за прыватызацыю.

Начальнік жыллёвага аддзела ў Гатава Наталля Герасіменка прапанавала Святлане знайсці ахвотнікаў абмяняцца з ёй кватэрамі. А потым проста прынесці дакументы ў ЖКУ. Цікава, а самі службоўцы захацелі б памяняцца са Святланай кватэрамі? Памяняць сухое, утульнае жыллё на сырую кватэру, якая атруціць здароўе ім і іх блізкім?

Святлана практычна страціла надзею дачакацца рамонту, які ЖЭС абяцае зрабіць ужо шмат гадоў. І тым больш не верыць, што зможа атрымаць іншую, хай маленькую, але нармальную кватэру.

ПРАЕКТ

# ЦІ ЗНОЙДЗЕЦЦА МЕСЦА ЗАПАВЕДНІКУ?

Вольга ХВОІН

**ГА «Ахова птушак Бацькаўшчыны» накіравала ў Міністэрства прыродных рэсурсаў хадайніцтва разгледзець аўтарскі праект, паводле якога ў запаведную зону мусіць увайсці паўночная частка заказніка «Сарачанскія азёры» (Астравецкі раён), а таксама будзе павялічаная яго плошча.**

Аўтарам праекту з'яўляецца былы дырэктар гэтага ж заказніка Ігар Пастухоў (летась Пастухова звольнілі з працы пасля таго, бо ён выступіў з крытыкай будаўніцтва АЭС побач з тэрыторыяй прыроднага заказніка). Паводле задумы аўтара, калі стварыць на Астравеччыне запаведную зону, гэта дазволіць захаваць унікальны прыродны азёрна-ландшафтны комплекс. Ігар Пастухоў прапануе вылучыць запаведную зону ядра, дзе забароненая амаль уся гаспадарчая дзейнасць і дапускаецца толькі экалагічная і турыстычная ў ашчадным варыянце, а таксама міграцыйныя калідоры для жывёл, зоны пакою, куды могуць хадзіць людзі, напрыклад, за грыбамі, ягадамі, тэрыторыі, дзе адпачываюць пералётныя птушкі.

«Я быў дырэктарам, валодаю сітуацыяй, таму разумею, што калі антрапагенная нагрузка будзе расці, то мы страцім гэты куток Беларусі, — тлумачыць свой выбар Астравеччыны для праекту Ігар Пастухоў. — Ужо цяпер на азёры вялікі наплыў людзей, яны не вытрымаюць такой нагрузкі, таму і прапаную паўночную частку заказніку адвесці пад запаведную зону». Спецыяліст тлумачыць, што стварыць запаведнік — доўгі працэдурны шлях. Але цяпер у Мінпрыродзе прынятыя папраўкі ў заканадаўства, паводле якіх можна стварыць лакальныя запаведныя зоны.

У праекце сістэматызаваныя і апісаныя аб'екты, якія маюць высокую прыродную ці культурную каштоўнасці. Усё ілюстравана фота- і відэаматэрыяламі. Апроч заказніка Сарачанскія азёры, у ахоўваемых тэрыторыі прапануецца вылучыць іншыя прылеглыя мясціны: ручай Свіранскі, раку Газоўка, месца ўпадзення Страчы ў Вілію. «Апошняе з'яўляецца куточкам дзікай некранутай прыроды, які пакуль не надта папулярны ў турыстаў, і яго магчыма захаваць у цяперашнім стане», — гаворыць Пастухоў. Агулам ён парэкамендаваў далучыць да запаведнай тэрыторыі 2000 гектар уздоўж мяжы з Літвой.

«Гэтая тэрыторыя заказніка з-за свайго месцазнаходжання найменш была засвоеная людзьмі, гаспадаркай. Памежная зона адсявае наведвальнікаў, і для прыроды гэта — добра. Але летась рэжым памежнай зоны з большай тэрыторыі заказніка быў зняты, і сюды хлынулі людзі, — расказвае пра шкоднасць антрапагеннага ўздзеяння экс-дырэктар заказніка. — Напрыклад, раней Альхоўскае вадасховішча было малалюдным, прырода нечым нагадвала карэльскую. Але пачалі прыязджаць людзі, і на берагах з'явіліся горы смецця».

Пастухоў перасцерагае эколагаў, чыноўнікаў, што будаўніцтва Астравецкай АЭС нанясе экасістэме вялікія страты. «Сюды прыедзе як мінімум трыццаць пяць тысяч чалавек, і што будзе з гэтымі азёрамі, як яны пачнуць ездзіць на пікнікі «на прыроду»?» — з адчаем зазначае спецыяліст.

«Перад сваім звальненнем з заказніка я пачаў працу па стварэнні запаведнай зоны, і рады, што яе завяршыў. Гэта адзін з першых праектаў у рэспубліцы, я думаю, што ён будзе добрым прыкладам для дырэктараў іншых заказнікаў, каб зрабіць нешта падобнае. Кіраўнікі заказнікаў мараць пра тое, каб у іх былі запаведныя тэрыторыі, тады можна будзе гаварыць аб ахове прыроды. Бо па заканадаўству, у заказніках гаспадараць усе хто заўгодна, апроч іх кіраўнікоў. Пра запаведныя зоны гаворка вялася яшчэ ў 1990-я, але гэта не рабілася, бо ў запаведніку нельга секчы дрэвы, а гэта ж невыгодна дзяржаве», — зазначае Ігар Пастухоў.



Адказ з Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя на прапанаваны праект Пастухова мусіць прыйсці на пачатку наступнага месяца.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 14 ЧЭРВЕНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** У свеце матораў.
**09.05** Nota Bene.
**09.35** Здароўе.
**10.00** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**10.55** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**11.35** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** Лірычная камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць» (Расія).
**14.05** «Культурныя людзі».
**14.30** «Уласнай персонай».
**15.15, 18.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Т-чалавек: заказаны ў рызыку».
**15.55** Серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
**17.05** Відэафільм АТН «Прабач мяне».
**17.30** Арэна.
**17.50, 00.20** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**18.25** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Ток-шоў «Ход у адказ».
**20.30** Панарама.
**21.10** Адмысловы рэпартаж АТН «Фэст нацыянальных культур».
**21.25** Футбол. Чэмпіянат свету. Італія-Парагвай. Прамая трансляцыя.
**23.25** Серыял «Часткі цела-5 «(ЗША).
**00.25** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10, 01.55** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** Тэорыя неверагоднасці.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Мікі Маўс. Хатні клуб».
**11.30** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.30** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Тата на ўсе рукі».
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Выбар».
**22.10** «Застацца ў жывых». Шматсерыйны фільм. V-ы сезон. 3-я серыя.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Злачынствы стагоддзя».
**00.05** «Авіяслалам. Чэмпіянат свету».
**01.05** Шматсерыйны фільм «Тая, што размаўляе са зданямі».
**02.10** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** «Вялікі горад».
**15.40** «Далёкія сваякі».
**16.00** «Культурнае жыццё».
**16.50** «Дабро пажаліцца».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.40** Фільм «Выйсце». Украіна, 2009 г.
**22.55** «Сталічны футбол».
**23.25** Фільм «Дзеці шпіёнаў 3: гульня скончана». ЗША, 2003 г.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.25** У гэты дзень.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Кінааповесць «Вячэрні звон» (Расія).
**12.00** «Пра мастацтва».
**12.30** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**13.25** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**14.25** Футбол. Чэмпіянат свету. Нідэрланды-Данія. Прамая трансляцыя.
**16.25** Жаночая ліга.
**16.55** Футбол. Чэмпіянат свету. Японія-Камерун. Прамая трансляцыя.
**18.55** Містычны дэтэктыў «Бухта страху».
**19.55** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.20** Камедыйны серыял «Універ» (Расія).
**21.55** Баявік «Антыкілер». 1-я серыя.
**23.00** Жаночая ліга.
**23.30** «Час футболу». Чэмпіянат свету-2010.

### РОССИЯ

**07.00** Камедыя «Чарадзейная сіла».
**08.20** Мультфільм.
**08.30** Фільм «24-25» не вяртаецца».
**10.20** «Ранішняя пошта».
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.20** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**12.20** Фільм «Мой пяшчотна каханы дэтэктыў».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.15** Меладрама «Шчасце па рэцэпце».
**16.10** Камедыя «Максім Перапяліца».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Камедыя «Максім Перапяліца». Працяг.
**18.05** Прэм'ера. Юбілейны канцэрт Кіма Брэйтбурга.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі тыдня.
**20.00** Прэм'ера. Юбілейны канцэрт Кіма Брэйтбурга. Працяг.
**21.30** Фільм «Арэлі». Расія, 2007 г.
**23.20** «Нічога асабістага».
**23.35** Навіны - Беларусь.
**23.45** Фільм «Так бывае». Расія, 2007 г.

### НТВ

**06.30** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**07.10** «Следства вялі…».
**08.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**08.20** Прэм'ера. Меладрама «Хусткі».
**10.20** «І зноў добры дзень!».
**11.05** Серыял «Афіцэры-2».
**13.20** Серыял «Афіцэры-2». Працяг.
**16.15** Серыял «Афіцэры-2». Заканчэнне.
**19.25** Фільм «Настаўнік у законе».
**21.15** Вострасюжэтны серыял «Мент у законе. Паляванне на аўтарытэта».

### EUROSPORT

**09.30** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР.
**10.00** Ралі. Сусветны тур па ралі рэйду (Эштарыл, Партугалія - Маракеш, Марока). 8-ы этап.
**10.30, 14.05, 17.30** Аўтаспорт. Аўтагонкі. 24 гадзіны Ле-Мана (Францыя).
**11.30** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР.
**12.00, 15.30** Тэніс. Queen's. Турнір АТР у Вялікабрытаніі (Лондан). Фінал.
**13.15, 16.45** Веласпорт. Велагонка ў Францыі. 7-ы этап.
**14.00** Навіны.
**16.30** Навіны.
**16.35, 21.05, 23.30** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**19.00** Навіны.
**19.05** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**19.15** Тэніс. Queen's. Турнір АТР у Вялікабрытаніі (Лондан). Фінал.
**19.55** Навіны.
**20.00** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**20.10** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Краіны Еўропы. Часопіс.
**20.35** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. ПАР. Часопіс.
**21.00** Навіны.
**21.15** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Краіны Афрыканская кантынента. Часопіс.
**21.50** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**00.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Усе зоркі.
**01.30** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. ПАР. Часопіс.
**02.00** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**07.40, 20.00** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**08.05** Басанож па свеце.
**08.30** Дак. гадзіна: «Іншае жыццё», 2008 г.
**09.20** Вагон.
**09.25** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**10.25** «Загадкі Мэрдака», серыял.
**11.10** «Заказное забойства», маст. фільм.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Папялушка», тэлесерыял.
**17.30** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.30** Аўтастопам праз Еўропу: 2 серыя, «Германія».
**18.50** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.10** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.20** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.35** Еўропа сёння.
**20.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Бялінскага, 6», дак. фільм, 2009 г., Польшча–Расія.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**21.40** «Костка», маст. фільм, 1995 г., Польшча.
**23.05** Аб'ектыў.

## 15 ЧЭРВЕНЯ, АЎТОРАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Арэна.
**09.05** Серыял «Жыццё, якога не было...».
**09.55** Серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Адмысловы рэпартаж АТН «Фэст нацыянальных культур».
**12.10** Іранічная меладрама «Мужчынская інтуіцыя» (Украіна).
**14.05** Ток-шоў «Ход у адказ».
**15.15, 18.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Серыял «Генеральская ўнучка».
**16.25** Серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
**17.30** Сфера інтэрасаў.
**17.55, 00.20** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**18.25** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Серыял «Жыццё, якога не было...».
**20.30** Панарама.
**21.25** Футбол. Чэмпіянат свету. Бразілія-КНДР. Прамая трансляцыя.
**23.25** Серыял «Часткі цела-5» (ЗША).
**00.25** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Чакай мяне.
**10.00** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Мікі Маўс. Хатні клуб».
**11.30** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.30** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Тата на ўсе рукі».
**18.55** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Ярмолавы». Шматсерыйны фільм.
**22.10** «Выклік-3». Шматсерыйны фільм.
**23.15** Нашы навіны.
**23.30** Навіны спорту.
**23.35** «Зваротны адлік».
**00.10** Фільм «Тая, што размаўляе са зданямі».
**01.00** Нашы навіны.
**01.15** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** Фільм «Выйсце». Украіна, 2009г.
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Гучная справа».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.40** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Чаркізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
**22.55** «Рэпарцёр СТБ».
**23.25** «Аўтапанарама».
**23.45** Фільм «Мамант». ЗША, 2006г.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.45** Містычны дэтэктыў «Бухта страху».
**11.40** «Запал па культуры».
**12.25** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**13.20** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**14.25** Футбол. Чэмпіянат свету. Новая Зеландыя-Славакія. Прамая трансляцыя.
**16.25** Жаночая ліга.
**16.55** Футбол. Чэмпіянат свету. Кот - д'Івуар-Партугалія. Прамая трансляцыя.
**18.55** Містычны дэтэктыў «Бухта страху».
**19.55** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.20** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**21.55** Баявік «Антыкілер». 2-я серыя.
**23.00** Спорт-кадр.
**23.30** «Час футболу». Чэмпіянат свету-2010.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Аляксандр Каверзнеў. Афганскі капкан». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** «Нічога асабістага».
**11.40** «Пакой смеху».
**12.30** Тэлесерыял «Каменская».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.15** Тэлесерыял «Пуцявікі». Расія, 2008 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.25** Тэлесерыял «Пуцявікі». Расія, 2008 г.
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Тэлесерыял «Каменская».
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі».
**00.20** «Засакрэчаны Герай Савецкага Саюза». Дакументальны фільм.

### НТВ

**07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.25** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.25** «І зноў добры дзень!».
**09.15** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.50** Вострасюжэтны серыял «Агент нацыянальнай бяспекі».
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**15.05** «Выратавальнікі».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Настаўнік у законе. Працяг».
**21.40** Серыял «Час Волкава».
**23.50** «Галоўны герой прадстаўляе…».
**00.35** «Асабліва небяспечны!».

### EUROSPORT

**09.30** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР.
**10.00** Веласпорт. Велагонка ў Францыі. 7-ы этап.
**10.45** Вось дык так!!!
**11.00** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Краіны Еўропы. Часопіс.
**11.30** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР.
**12.00** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. ПАР. Часопіс.
**12.30** Тэніс. Queen's. Турнір АТР у Вялікабрытаніі (Лондан). Фінал.
**13.25** Навіны.
**13.30** Тэніс. Турнір WTA у Вялікабрытаніі (Істборн). Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.
**16.30** Навіны.
**16.35** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**16.45** Тэніс. Турнір WTA у Вялікабрытаніі (Істборн). Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.
**17.30** Тэніс. Турнір АТР у Вялікабрытаніі (Істборн). Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.
**19.00** Навіны.
**19.05** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**19.15** Тэніс. Турнір АТР у Вялікабрытаніі (Істборн). Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.
**21.15** Навіны.
**21.20** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**21.30** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна свету па версіі WBA у Вялікабрытаніі.
**22.00** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна свету па версіі WBA у Германіі.
**23.30** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Прамая трансляцыя.
**00.00** Аўтаспорт. Аўтагонкі. 24 гадзіны Ле-Мана (Францыя).
**01.15** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Часопіс.
**01.45** Сусветны тур па ралі рэйду (Эштарыл, Партугалія - Маракеш, Марока). 8-ы этап.
**02.15** Матаспорт па выхадных.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**07.20** Еўропа сёння.
**07.50** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**08.05** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**08.15** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**08.30** Аўтастопам праз Еўропу: 2 серыя, «Германія».
**08.50** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**09.15** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**09.25** «Мент», дэтэктыўны серыял.
**10.25** «Папялушка», тэлесерыял.
**10.50** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Бялінскага, 6», дак. фільм,Польшча–Расія.
**11.20** «Костка», маст. фільм, 1995 г., Польшча.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Папялушка», тэлесерыял.
**17.30** «Бездакорныя анёлкі», маст. фільм.
**19.00** Госць «Белсату».
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** Праект «Будучыня».
**20.10** Дак/ гадзіна: «Іншае жыццё», 2008 г.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Апошні сезон», серыял.
**22.15** YoLife! (маладзёвая праграма).
**22.30** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 16 ЧЭРВЕНЯ, СЕРАДА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.05** Серыял «Жыццё, якога не было...».
**09.55** Серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Відэафільм АТН «Браслаўскія азёры» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Камедыя «Барын» (Расія).
**14.05** «Уласнай персонай».
**14.30** «Альманах вандраванняў».
**15.15, 18.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Серыял «Генеральская ўнучка».
**16.20** Серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
**17.30** «Зямельнае пытанне».
**17.50, 00.15** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**18.25** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**19.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНО».
**19.35** Серыял «Жыццё, якога не было...».
**20.30** Панарама.
**21.25** Футбол. Чэмпіянат свету. ПАР-Уругвай. Прамая трансляцыя.
**23.25** Серыял «Часткі цела-5» (ЗША).
**00.20** Дзень спорту.

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.15, 01.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Выклік-3». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Мікі Маўс. Хатні клуб».
**11.30** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**12.00** «Малахаў +».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.30** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Тата на ўсе рукі».
**18.55** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Ярмолавы». Шматсерыйны фільм.
**22.10** Прэм'ера. «Выклік-3». Шматсер. фільм.
**23.30** Навіны спорту.
**23.35** «Дакументальны дэтэктыў».
**00.10** Шматсерыйны фільм «Тая, што размаўляе са зданямі».
**01.15** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.35** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Чаркізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
**22.55** «Мінск і мінчане».
**23.25** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**23.50** Фільм «Без тармазоў». Германія, 2008г.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Містычны дэтэктыў «Бухта страху».
**11.30** Медычныя таямніцы.
**11.55** Спорт-кадр.
**12.30** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**13.25** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**14.25** Футбол. Чэмпіянат свету. Гандурас-Чылі. Прамая трансляцыя.
**16.25** Жаночая ліга.
**16.55** Футбол. Чэмпіянат свету. Іспанія-Швейцарыя. Прамая трансляцыя.
**18.55** Містычны дэтэктыў «Бухта страху».
**19.55** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.20** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**21.55** Баявік «Антыкілер». 3-я серыя, закл.
**23.00** Жаночая ліга.
**23.30** «Час футболу». Чэмпіянат свету-2010.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Бунт Іхтыяндра. Аляксандр Бяляеў». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**12.15** Тэлесерыял «Каменская».
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.25** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.15** Тэлесерыял «Пуцявікі». Расія, 2008 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.25** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.20** Тэлесерыял «Пуцявікі». Расія, 2008 г.
**22.15** Тэлесерыял «Дворык».
**22.50** Тэлесерыял «Каменская».
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі».
**00.20** «Кошт зорнай ролі». Дак. фільм.

### НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Следства вялі…».
**09.20** «Іх норавы».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.50** «Кватэрнае пытанне».
**11.55** Вострасюжэтны серыял «Агент нацыянальнай бяспекі».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**15.05** «Галоўная дарога».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Настаўнік у законе. Працяг».
**21.35** Серыял «Час Волкава».
**23.25** Сёння.
**23.50** «Позняя гутарка».
**00.35** «Першая кроў».

### EUROSPORT

**09.30** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР.
**10.00** Паралімпізм. Кубак свету ў Вялікабрытаніі (Манчэстэр).
**11.00** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Краіны Афрыканскага кантынента. Часопіс.
**11.30** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР.
**12.00** Тэніс. Турнір WTA у Вялікабрытаніі (Істборн). Дзень 2-і.
**13.25** Навіны.
**13.30** Тэніс. Турнір WTA у Вялікабрытаніі (Істборн). 1/8 фіналу. Прамая трансляцыя.
**16.30** Навіны.
**16.35** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**16.45** Тэніс. Турнір WTA у Вялікабрытаніі (Істборн). 1/8 фіналу. Прамая трансляцыя.
**17.30** Тэніс. Турнір ATP у Вялікабрытаніі (Істборн). 1/8 фіналу. Прамая трансляцыя.
**19.00** Навіны.
**19.05** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**19.15** Тэніс. Турнір ATP у Вялікабрытаніі (Істборн). 1/8 фіналу. Прамая трансляцыя.
**21.15** Навіны.
**21.20** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**21.30** Абранае па серадах.
**21.35** Навіны коннага спорту.
**21.40** Гольф. Тур PGA. Турнір St. Jude Classic (Мемфіс, ЗША).
**22.40** Гольф. Еўратур. Адкрыты чэмпіянат Партугаліі (Эштарыл).
**23.10** Гольф-клуб.
**23.15** Яхт-клуб.
**23.20** Абранае па серадах.
**23.30** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Прамая трансляцыя.
**00.00** «Еўраспорт за чыстую планету».
**00.30** «Спартовы вандроўца». Часопіс.
**00.45** Тэніс. Турнір WTA у Вялікабрытаніі (Істборн). 1/8 фіналу.
**02.00** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**07.20** Праект «Будучыня».
**07.50** Госць «Белсату».
**08.15** YoLife! (моладзевая праграма).
**08.30** Дак. гадзіна: «Іншае жыццё», 2008 г.
**09.20** «Апошні сезон», серыял.
**10.15** «Папялушка», тэлесерыял.
**10.40** «Бездакорныя анёлкі», маст. фільм, 1998 г., Канада–ЗША.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Папялушка», тэлесерыял.
**17.30** «Апошні сезон», серыял.
**18.25** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**18.40** Невядомая Беларусь: «Берасцейская крэпасць – дзве абароны», дак. фільм, 2009 г.
**19.10** Хто ёсць кім?: Цацачны гандляр з Давыд-Гарадка.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** На колах.
**20.05** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**20.25** Хто ёсць кім?: Юрый Хадыка.
**20.40** Побач з намі.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Форум: «Мільярды для рэгіёнаў».
**22.05** «Калядная гісторыя», рамантычная камедыя, 1996 г., ЗША.
**23.30** Аб'ектыў.

## 17 ЧЭРВЕНЯ, ЧАЦВЕР

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Зямельнае пытанне».
**09.05** Серыял «Жыццё, якога не было...».
**09.55** Серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** Прэм'ера. Меладрама «Любка» (Расія). 1-я серыя.
**13.45** Дак. цыкл «Фартыфікацыя».
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**15.15, 18.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Дэтэктыўны серыял «Генеральская ўнучка» (Расія).
**16.30** Серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
**17.30** Сфера інтэрасаў.
**17.50, 00.20** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**18.25** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Серыял «Жыццё, якога не было...».
**20.30** Панарама.
**21.10** «Актуальнае інтэрв'ю».
**21.25** Футбол. Чэмпіянат свету. Францыя-Мексіка. Прамая трансляцыя.
**23.25** Серыял «Часткі цела-5» (ЗША).
**00.25** Дзень спорту.

### ОНТ

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Выклік-3». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Мікі Маўс. Хатні клуб».
**11.30** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.30** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Тата на ўсе рукі».
**18.55** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Ярмолавы». Шматсерыйны фільм.
**22.10** Прэм'ера. «Выклік-3». Шматсер.фільм.
**23.15** Нашы навіны.
**23.30** Навіны спорту.
**23.35** АНТ прадстаўляе: «Выбар +».
**00.05** Шматсерыйны фільм «Тая, што размаўляе са зданямі».
**00.55** Нашы навіны.
**01.10** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Я-вандроўца».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Фантастычныя гісторыі».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.40** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Чаркізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
**22.55** «Асабісты інтэрас».
**23.25** «Аўтапанарама».
**23.45** Фільм «Заблытаны». Канада-Францыя, 1993г.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.45** Містычны дэтэктыў «Бухта страху».
**11.40** Жывы гук.
**12.25** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**13.20** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**14.25** Футбол. Чэмпіянат свету. Аргентына-Паўднёвая Карэя. Прамая трансляцыя.
**16.25** Жаночая ліга.
**16.55** Футбол. Чэмпіянат свету. Грэцыя-Нігерыя. Прамая трансляцыя.
**18.55** Містычны дэтэктыў «Бухта страху» (Расія). Заключная серыя.
**19.55** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.20** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**21.55** Біяграфічная драма «Ганна Ніколь» (ЗША).
**23.30** «Час футболу». Чэмпіянат свету-2010.
**00.10** Культасвет.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Праклён фараонаў». Дак. фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**12.15** Тэлесерыял «Каменская».
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.15** Тэлесерыял «Пуцявікі». Расія, 2008 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.25** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.20** Тэлесерыял «Пуцявікі». Расія, 2008 г.
**22.15** Тэлесерыял «Дворык».
**22.50** Тэлесерыял «Каменская».
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі».
**00.20** «Апантаны Ралан». Дак. фільм.

### НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Бульдог-шоў».
**09.20** «Жаночы погляд».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.50** «Дачны адказ».
**11.50** Вострасюжэтны серыял «Агент нацыянальнай бяспекі».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Настаўнік у законе. Працяг».
**21.35** Вострасюжэтны серыял «Час Волкава».
**23.25** Сёння.
**23.50** «Асабліва небяспечны!».

### EUROSPORT

**09.30** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР.
**10.00** Тэніс. Турнір ATP у Вялікабрытаніі (Істборн). 1/8 фіналу.
**11.00** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.
**11.30** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР.
**12.00** Тэніс. Турнір WTA у Вялікабрытаніі (Істборн). 1/8 фіналу.
**13.25** Навіны.
**13.30** Тэніс. Турнір WTA у Вялікабрытаніі (Істборн). 1/4 фіналу. Прамая трансляцыя.
**16.30** Навіны.
**16.35** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**16.45** Тэніс. Турнір WTA у Вялікабрытаніі (Істборн). 1/4 фіналу. Прамая трансляцыя.
**17.30** Тэніс. Турнір ATP у Вялікабрытаніі (Істборн). 1/4 фіналу. Прамая трансляцыя.
**19.00** Навіны.
**19.05** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**19.15** Тэніс. Турнір ATP у Вялікабрытаніі (Істборн). 1/4 фіналу. Прамая трансляцыя.
**21.15** Навіны.
**21.20** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**21.30** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. K1 World Max (Японія).
**23.30** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Прамая трансляцыя.
**00.00** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**01.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**01.30** Тэніс. Турнір WTA у Вялікабрытаніі (Істборн). 1/4 фіналу.
**02.00** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**07.20** На колах.
**07.50** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**08.05** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**08.15** Побач з намі.
**08.30** Хто ёсць кім?: Юрый Хадыка.
**08.50** Невядомая Беларусь: «Берасцейская крэпасць – дзве абароны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**09.15** Хто ёсць кім?: Цацачны гандляр з Давыд-Гарадка.
**09.35** «Папялушка», тэлесерыял.
**10.00** «Апошні сезон», серыял.
**10.55** «Калядная гісторыя», рамантычная камедыя, 1996 г., ЗША.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Папялушка», тэлесерыял.
**17.25** «Калядная гісторыя», рамантычная камедыя, 1996 г., ЗША.
**18.55** Жаўтуха (сатырычная праграма).
**19.25** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.35** Праект «Будучыня».
**20.05** «Ваенны фатограф», дак. фільм, 2001 г., Швейцарыя.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Зграя», сенсацыйны серыял.
**22.15** «Курдыстан зблізку», дак. фільм, 2007 г., Германія.
**00.00** Аб'ектыў.

## 20 ЧЭРВЕНЯ, НЯДЗЕЛЯ

**1**

**07.30** Меладрама «Дзядуля ў падарунак» (Расія-Украіна).
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.05** «Арсенал».
**09.35** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.50** «Альманах вандраванняў».
**10.20** «Культурныя людзі».
**10.55** «У свеце матораў».
**11.25** «Nota Bene».
**12.10** Лірычная камедыя «Верныя сябры».
**14.00** Дакументальны фільм «Верныя сябры». Невядомая версія» (Украіна).
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Відэафільм АТН «Т-чалавек: неўтаймаваныя».
**16.00** Камедыйная меладрама «Амерыканская дачка» (Расія).
**17.55** Суперлато.
**18.50** Прэм'ера. Дакументальна-гістарычны цыкл «У пошуках ісціны» (Украіна).
**19.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.55** «КЕНО».
**20.00** «У цэнтры ўвагі».
**21.25** Футбол. Чэмпіянат свету. Бразілія-Кот-д'Івуар. Прамая трансляцыя.
**23.25** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).

**ОНТ**

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Серыял «Мая выдатная няня», 2004 г.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.10** «Шчасце ёсць!».
**12.00** «Ранішняя пошта».
**12.35** Прэм'ера. «Юры Саломін. Я заўсёды маю рацыю».
**13.35** «Разумніцы і разумнікі».
**14.20** Новы «Ералаш».
**14.35** «Песні Перамогі».
**15.05** Севастопальскія апавяданні.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** АНТ прадстаўляе: «Гарады-героі. Масква».
**17.15** Прэм'ера. «Наталля Селязнёва. 3 шырока расплюшчанымі вачамі».
**18.20** Прэм'ера. «Містэр Трололо». Творчы вечар Эдуарда Хіля.
**20.00** Контуры.
**21.05** Прэм'ера. «Трамвай у Парыж». Беларусь, 2010.
**23.05** Фільм «Улюбёнцы Амерыкі».

**СТВ**

**06.50** «Афрамасквіч-2». Камедыйны серыял.
**07.40** Фільм «Паўтара рыцары: у пошуках выкрадзенай прынцэсы Херцэліндэ». Германія, 2008г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.20** «Добры дзень, доктар!».
**13.50** Фільм «Вялікая сям'я». СССР, 1954г.
**15.55** «Военная таямніца».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэпарцёр СТБ».
**17.20** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень».
**20.40** Фільм «Каханне і танцы». ЗША, 2009 г.
**22.25** СТБ прадстаўляе: «Супердыскач 90-х Mega Hits».
**00.35** Фільм «Пакой». Бельгія, 2006г.

**ЛАД**

**07.20** Дабравест.
**07.45** Мір вашай хаце.
**07.55** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**08.20** Дакументальна-пазнавальны фільм «Сейшэлы — жамчужына Індыйскага акіяну» (Францыя).
**09.25** Нашы тэсты.
**10.05** Школа рамонту.
**11.00** Медычныя таямніцы.
**11.40** Кінаспробы.
**12.00** Бухта капітанаў.
**12.40** «Правы чалавека».
**12.55** Гаспадар.
**13.25** Конкурс маладых музыкаў «Маладыя таленты Беларусі».
**14.25** Футбол. Чэмпіянат свету. Славакія-Парагвай. Прамая трансляцыя.
**16.25** Жаночая ліга.
**16.55** Футбол. Чэмпіянат свету. Італія-Новая Зеландыя. Прамая трансляцыя.
**18.55** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**19.45** Смешная часіна.
**20.25** Тэлебарометр.
**20.45** Экспедыцыя.
**21.15** Трагікамедыя «Тут паляць» (ЗША).
**23.00** Свая музыка. Працяг.
**23.30** «Час футболу». Чэмпіянат свету-2010.
**00.10** Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы.

**РОССИЯ**

**07.00** «Уся Расія».
**07.15** «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
**07.45** Фільм «Трэцяга не дадзена». 2009 г.
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**12.30** Фільм «Служкі д'ябла».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Сумленны дэтэктыў».
**14.45** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**15.15** Фільм «Заўтра была вайна».
**17.00** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**19.00** Весткі тыдня.
**20.00** 1/4 фіналу першай лігі «КВЗ».
**22.05** Прэм'ера. Юбілейны канцэрт Алега Газманава.
**00.10** Фільм «Жартаваць будзеце?».

**НТВ**

**07.40** Мультфільм.
**08.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.50** «Асабліва небяспечны!».
**11.25** «Першая кроў».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.20** «Лепшы горад зямлі».
**14.10** Камедыя «Пякельны хмарачос».
**16.25** «І зноў добры дзень!».
**17.25** «Масквічы».
**18.20** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**19.55** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.50** «Бульдог-шоў».
**21.45** Меладрама «Нулявы кіламетр».
**23.30** «Авіятары».
**00.05** «Асабліва небяспечны!».

**EUROSPORT**

**09.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг (Зольдэр, Бельгія). Кваліфікацыя.
**10.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг (Бельгія). Прамая трансляцыя.
**10.30** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно (Ле-Ман, Францыя). 1-я гонка.
**11.00** Веславанне. Кубак свету ў Германіі (Мюнхен). Прамая трансляцыя.
**13.40, 19.00, 20.00, 21.00** Навіны.
**13.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг (Бельгія). Прамая трансляцыя.
**14.45** Аўтаспорт. Формула-2 (Зольдэр, Бельгія). 2-я гонка. Прамая трансляцыя.
**15.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг (Бельгія). Прамая трансляцыя.
**17.00** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно (Ле-Ман, Францыя). 2-я гонка.
**17.30** Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы ў Нарвегіі (Берген). Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.
**19.05** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**19.15** Веславанне. Кубак свету ў Германіі.
**20.05** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**20.15** Летні біятлон. Гран-пры ў Швейцарыі.
**21.05** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Навіны. Прамая трансляцыя.
**21.15** Матаспорт па выходных.
**21.30** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна свету па версіі WBA у Вялікабрытаніі.
**23.15** Вось дык так!!!
**23.30** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР. Прамая трансляцыя.
**00.00** Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы ў Нарвегіі (Берген). Дзень 2-і.
**01.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг (Зольдэр, Бельгія).
**01.45** Матаспорт па выходных.
**02.00** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург, ПАР.

**БЕЛСАТ tv**

**07.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**07.10** Еўропа сёння.
**07.40** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**07.55** Побач з намі.
**08.10** «Рок назаўжды», дак. фільм, 2008 г., Беларусь, ч. 1.
**08.40** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**08.50** Чалавек-эпоха: «Сталін. Смерць дыктатара», дак. фільм, 2003 г., Германія.
**09.50** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**10.15** «Аблавушак», мультсерыял.
**10.40** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**11.25** «Дванаццатая ноч, ці Што заўгодна», маст. фільм, Вялікабрытанія–Ірландыя–ЗША.
**17.00** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**17.30** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.25** Дакументальная гадзіна: «Рэвалюцыя ў эфіры», дак. фільм, 2005 г., Германія.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.35** «Загадкі Мэрдака», серыял.
**19.25** Вагон.
**20.30** Басанож па свеце.
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Фільматэка майстроў: «Боскае ўмяшанне», маст. фільм, 2002 г., Францыя–Германія.
**23.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».

---

## Шаноўныя чытачы!

**Пры афармленні падпіскі будзьце ўважлівымі: з 1 мая змяніліся нашы рэквізіты ў банку. Нумар рахунку: 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Падпісацца можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

### Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

### Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Ідзем у адзяленне банка і на адмысловым бланку пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
2. Указваем суму аплаты і здзяйсняем пералік грошай.
3. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
4. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ______
Всего ______

Кассир

## Для тых, хто прымае рашэнні!

Новы час

www.novychas.org

ЦІКАВА

# ПЛАНЕТА КУБІКА РУБІКА

Іван БІЧ

**Трыццаць гадоў таму ў еўрапейскіх крамах з'явіўся так званы «магічны куб», які ўвесь свет ведае як кубік Рубіка**



Венгерскаму інжынеру Эрнё Рубіку з яго вынаходкай вельмі пашчасціла. Мала хто ведае, што за некалькі год да з'яўлення «магічнага куба» ў Канадзе, ЗША і Японіі механікі атрымалі патэнт на падобную цацку.

Механізм галаваломкі ўяўляе сабою пластмасавы куб, складзены з некалькіх кубікаў меншага памеру, здольных круціцца вакол нябачных звонку восяў. Задача гульца ў тым, каб, паварочваючы бакі куба, прывесці яго ў такі стан, калі кожная грань будзе складацца з квадратаў аднаго колеру.

Аднак чамусьці кампаніі, якія выраблялі цацкі і галаваломкі — распрацоўкі канадскіх і японскіх геніяў — на канвеер іх не паставілі. Пазней, у 1980-я гады, канадцы і японцы без поспеху спрабавалі праз суд абвінаваціць Рубіка ў парушэнні аўтарскага права і нават у плагіяце.

Так ці інакш, у выніку ўся слава і вялікія грошы дасталіся венгру.

Хаця на пачатку ні пра якія прыбыткі Эрнё Рубік (нарадзіўся ў 1943 годзе) нават не думаў. Вынаходнікам (на той момант выкладчыкам школы прыкладнога мастацтва ў Будапешце) рухала простая задача — растлумачыць вучням прынцып трохмернай прасторы.

Пры гэтым, як пазней пісаў Рубік, яго інтрыгавала ідэя механічнай гармоніі, трансфармацыя аб'екта на месцы, архітэктурная змена аб'екта. Магчыма, фантазіі Рубіка падчас працы над кубікам былі значна больш карысныя, чым матэматычныя веды (у школе па матэматыцы Эрнё меў толькі чатыры).

У выніку нарадзіўся вядомы ўсім кубік. Ужо стварыўшы яго, Рубік зразумеў, што цацка мае цікавыя дадатковыя эфекты. Колькасць магчымых камбінацый кубіка Рубіка роўная 43 252 003 274 489 856 000. З улікам арыентацыі цэнтральных квадратаў, колькасць камбінацый узрастае да 88 580 102 706 155 225 088 000. Кубік дазваляў стварыць вялікую колькасць лагічных аперацый.

У 1975 годзе нехта з сяброў прапанаваў Рубіку запатэнтаваць вынаходку. Фабрыка цацак у Будапешце ў 1976 годзе выпусціла пробную партыю кубікаў. Яна мела вялікі поспех на мясцовым рынку. Чуткі пра незвычайную венгерскую цацку паступова праніклі па той бок жалезнай завесы.

На навінку ў венгерскіх крамах звярнула ўвагу вядомая міжнародная кампанія *Ideal Toys*. Яе агенты прыехалі ў Будапешт і заключылі з Рубікам дамову.

У лютым—сакавіку 1980 года ў крамах ЗША і Германіі з'явіўся новы прадукт — «Магічна куб».

Вынік быў непрадказальны. Маркетолагі *Ideal Toys* марылі прадаць за першы год мільён кубікаў. У выніку прадалі ў 30 раз больш.

Увогуле, з таго часу па ўсяму свету прадалі 350 мільёнаў кубікаў Рубіка. Некаторыя лічаць, што кубік — самая папулярная цацка ў гісторыі. Прычым гаворка пра класічныя кубікі. А яшчэ ёсць трохкутнікі Рубіка, шары Рубіка, змейкі Рубіка.

Простай камерцыяй справа не абмяжавалася. Лічыцца, што кубік Рубіка паўплываў на такі жанр мастацтва, як сучасны кубізм. Існуе нават такі накірунак — рубікаўскі кубізм. Дарэчы, у Нью-Йорку знаходзіцца помнік у гонар кубіка Рубіка.

Кубік Рубіка хутка стаў часткай масавай культуры. Дызайнеры часта выкарыстоўвалі яго выяву падчас афармлення афішаў фільмаў або вокладак кніг з дэтэктыўным сюжэтам. Кубік Рубіка можна пабачыць у такіх вядомых фільмах, як «Армагедон», «Быць Джонам Малкавічам», «Праект Манхэтэн», серыял «Сімпсаны».




HOWTO: solve a Rubik's cube in 6 seconds!



У дыснееўскім мультфільме «Walle» кубік з'яўляецца адным з сімвалаў чалавечай цывілізацыі. На амерыканскім тэлебачанні ў пачатку 1980-х гадоў існавала нават шоу «Рубік — магічны куб». У Злучаных Штатах дзейнічае група, якая называецца «Людзі кубіка».

Не адстаў ад свету і былы СССР. Кубік Рубіка на пачатку 1980-х гадоў стаў амаль абавязковым атрыбутам прагрэсіўнай савецкай сям'і разам з поўным зборам твораў Александра Дзюма, касетным магнітафонам і джынсамі. Падчас пераменаў школьнікі і студэнты праводзілі нефармальныя турніры — хто хутчэй збярэ кубік.

Яшчэ большыя маштабы спаборніцтвы набылі на Захадзе. Хутка ўзнік від спорту — *speedcuning*. Цяперашні тытул чэмпіёна належыць нідэрландскаму студэнту Эрыку Акерсдэйку. На турніры ў Чэхіі ў 2008 годзе ён сабраў грані кубіка за 7 секунд. Чэмпіёнам свету 2009 стаў брытанец Брэндан Волас, які сабраў кубік за 10 секунд. Дарэчы, дасюль працягваюцца спрэчкі пра самую лепшую камбінацыю зборкі кубіка.

Што да Эрнё Рубіка, то пасля поспеху яго цацкі ў 1980 годзе, ён стаў адным з сімвалаў Венгрыі. Тагачасны камуністычны ўрад асыпаў яго падарункамі: даў дзяржаўную прэмію, месца галоўнага рэдактара часопіса галаваломак, сваю студыю дызайну. І галоўнае — дазволіў Рубіку атрымліваць свой працэнт ад продажу кубіка ў свеце. Ён стаў легальным сацыялістычным мільянерам. Гэта было выключэнне для таго часу. Для прыкладу, савецкі інжынер, які прыдумаў гульню «Тэтрыс», не атрымаў за сваю вынаходку ні капейкі.

Падзенне камунізму ніяк не адбілася на кар'еры Рубіка. У 1990 годзе ён стварыў сваю тэхнічную акадэмію. Рубік з'яўляецца аўтарам шматлікіх гульняў і камп'ютарных праграм.

Парадаксальна, аднак Рубік не лічыць сябе шчаслівым. Ён кажа, што з-за поспеху кубіка Рубіка ўсе яго іншыя вынаходкі і ідэі аказаліся вынаходкамі другога гатунку. Аднак нават ён застаецца рэалістам і прызнае, што без кубіка і яго варыяцый ён ніхто. Напярэдадні гадавіны выхаду кубіка Рубіка на рынак, вынаходнік прадставіў сваю новую цацку — «Кубік 360».

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Па некаторых дадзеных, Лукашэнка імкнецца атрымаць правa на нафтаздабычу ў Азербайджане. Гэта значыць, набыць свідравіны. Але іх можна набыць толькі па рынкавым кошце і толькі праз тэндэр. Без якіх-небудзь прэферэнцый. Але, і як у выпадку з Расіяй, поспеху Мінск у гэтай галіне не дасягае. Выключна з Чавесам у гэтым кірунку штосьці атрымліваецца.

**«Delfy» (Літва)**

Трэба мець на ўвазе, што Януковіча нейкі час называлі другім Лукашэнкам. У тым сэнсе, што ў ім таксама праяўлялася жаданне атрымаць ад Расіі ўсё выключна за прыгожыя словы пра любоў, сяброўства і братэрства. Але ці то эксперты памыліліся ў прагнозах, ці то Масква, што абпалілася на Лукашэнку, стала дзейнічаць з Януковічам больш цвёрда і катэгарычна, і ўкраінскі прэзідэнт абраў варыянт рэальнай прагматыкі. Яго квінтэсенцыяй, уласна, і сталі тыя самыя Харкаўскія пратаколы. Дарэчы, не выключана, што менавіта пасля гэтага Лукашэнка і пачаў ненавідзіць украінскага калегу... І не тое, каб Мінск пачаў раўнаваць ці зайздросціць. Хоць выказванні Лукашэнкі пра тое, што ў Беларусі таксама ёсць расійскія ваенныя базы, а таму, маўляў, яна таксама мае права на газавы дэмпінг, далі зразумець, што менавіта не спадабалася Бацьку. Але засмуціла яго нават не гэта. Ужо самі па сабе Харкаўскія дамовы паказалі, што Януковіч наўрад ці складзе Лукашэнку кампанію ў транзітным ціску на Расію.

**«Голос России» (Расія)**

Той факт, што беларуская апазіцыя слабая і бедная і не ўяўляе ніякай рэальнай пагрозы дзейснай улады, прымушае экспертаў і палітыкаў задумвацца пра знешнее ўздзеянне на беларускія выбары. Гісторыя прэзідэнта Кыргызстана Курманбека Бакіева павучальная для Лукашэнкі і выглядае абнадзейлівай для яго супернікаў. У сувязі з гэтым у асяроддзі як «штатнай» апазіцыі, так і сярод тых, каму папросту надакучыў дзейсны прэзідэнт, даводзіцца чуць пра своеасаблівыя надзеі на «руку Масквы», Бруселю ці Вашынгтона. Прычым на Расію, на грошах якой доўгія гады трымаўся рэжым Лукашэнкі, ускладаюцца самыя вялікія надзеі.

**«Независимая газета» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ГЕРМАНІЯ. 30 ГАДОЎ ВОЛЬНАЙ РЭСПУБЛІЦЫ ВЕНДЛАНД

Германскія эколагі адзначаюць 30-ю гадавіну стварэння так званай Свабоднай рэспублікі Вендланд. 6 чэрвеня 1980 года, пратэстуючы супраць практыкі захавання адыходаў АЭС пад горадам Горлебен, эколагі захапілі суседні лес і вырашылі застацца тут жыць. Быў створаны своеасаблівы гарадок з зямлянак. Іх жыхары заявілі, што тэрыторыя выходзіць са складу ФРГ. Адначасова была абвешчана Свабодная рэспубліка Вендланд, якая існавала пару месяцаў. За гэты час грамадзяне Вендланда спрабавалі прабрацца на тэрыторыю магільніка і парушыць інфраструктуру, праз якую ўвосень павінен быў прайсці канвой з адыходамі. У сваю чаргу, паліцыя спрабавала выдаліць людзей з тэрыторыі вакол аб'екту. У ход ішлі бульдозеры і трактары. Адначасова па ўсёй краіне адбыліся акцыі салідарнасці з Вендландам. Пратэсты пакінулі вялікі след у нямецкай народнай культуры. Узнік цэлы накірунак у музычным фальклоры, звязаны з барацьбой за Вендланд. Цяпер тыя, каго 30 гадоў таму ганялі паліцэйскія, публічныя героі. Шмат хто з іх прыехаў на гадавіну падзей. Акрамя экскурсаў у гісторыю, былыя лідэры Вендланда заклікалі арганізаваць ураду Меркель, які выступае за развіццё атамнай індустрыі, гарачую восень, каб не дапусціць праходу атамнага канвою ў Горлебен у бліжэйшы верасень.

**Па матэрыялах «TAZ» (Германія)**

### УКРАІНА. ЗНОЎ ПРА МЭРА ЧАРНАВЕЦКАГА

Вядомы сваімі арыгінальнымі выхадкамі кіеўскі мэр Леанід Чарнавецкі зноў абняславіўся. Усё пачалося з таго, што мэра заклікалі адкрыць адрамантаваны помнік заснавальнікам горада — легендарным братам Харыву, Кію, Шчэку і іх сястры Лебедзь. Як кажа легенда, гэтыя людзі прыкладна ў VI стагоддзі заснавалі на адным з пагоркаў над Дняпром пасяленне. Пасля смерці Кія ў яго гонар горад назвалі Кіевам. Увогуле, гэту гісторыю ведае кожны школьнік. Аднак не Чарнавецкі. Падчас мітынгу адкрыцця манумента ён сказаў наступную фразу: «Гэта помнік заснавальнікам Кіева Харыву, іх сястры Шчэ, Кію, Шчэку і іх сястры Лебедзі». Цытата адразу стала культавай, хаця на гэты раз у каментарах прысутнічаюць новыя ноткі. Як вядома, урад рыхтуе ўказ пра змену статусу Кіева. Таксама плануюцца выбары мэра. З улікам таго, што на двары крызіс, прыход новага галавы наўрад ці палепшыць эканамічны стан. Аднак дакладна наступны мэр будзе не такім вясёлым, як Чарнавецкі.

**Па матэрыялах украінскай прэсы**

### МАНГОЛІЯ. БУНТ СУПРАЦЬ МЯСА

У Манголіі шырыцца рух, які, здавалася, не павінен быў прыжыцца на зямлі, дзе колькасць галоў ската адносна колькасці людзей 14 да 1, а штогадовае спажыванне мяса на душу насельніцтва перавышае 90 кілаграмаў. Між тым, па ўсёй краіне назіраецца бум вегетарыянскіх рэстаранаў. Першы вегетарыянскі рэстаран пад назвай «Ananda's Cafe» адкрыўся ў Манголіі ў 2006 годзе. Сёння колькасць падобных устаноў толькі ў сталіцы краіны Улан-Батары пераваліла за 20. Сустракаюцца яны і ў правінцыі. У цэлым па Манголіі налічваецца каля 30–40 тысяч вегетарыянцаў — гэта трохі больш за 1 працэнт насельніцтва. Напрыклад, у Злучаных Штатах, па дадзеных партала *vegitariantimes.com*, вегетарыянцы складаюць каля 3 працэнтаў сталага насельніцтва. Хаця не выключана, што рост моды на вегетарыянства сярод манголаў — гэта спосаб знайсці працу ў рэстаранах, якія належаць багатым індускім, японскім і будыйскім сектам. Адна з афіцыянтак вегетарыянскага рэстарана прызналася журналістам, што любіць мяса. Аднак есці яго не можа, каб не страціць працоўнае месца.

**Па матэрыялах vegitariantimes.com**

### ПОЛЬШЧА. КАПЕЛАН РОБІЦЦА СВЯТЫМ

6 чэрвеня ў Варшаве адбылася ўрачыстая цырымонія беатыфікацыі ксяндза Ежы Папялушкі — капелана «Салідарнасці», які быў закатаваны камуністычнымі спецслужбамі ў кастрычніку 1984 года.

Нарадзіўся Ежы Папялушка 14 верасня 1947 года ў вёсцы Акопы на Беласточчыне. Яго бацькі былі простымі сялянамі. У сям'і шанавалася памяць дзядзькі, які загінуў з шэрагах Арміі Краёвай ды загінуў ад рук камуністаў. У 1965 годзе Ежы Папялушка паступіў у Мітрапалітальную духоўную семінарыю ў Варшаве. У 1972 годзе стаў ксяндзом.

Калі ў 1981 годзе рух «Салідарнасці» стаў набіраць моц, ксёндз Папялушка служыў набажэнствы на ахопленых страйкамі варшаўскіх прадпрыемствах. Пасля ўвядзення ў снежні таго ж года ваеннага становішча ксёндз Ежы стаў праводзіць у варшаўскім касцёле св. Станіслава Косткі Імшу за Айчыну. На гэтыя набажэнствы збіраліся тысячы людзей, якія прагнулі знайсці для сябе хрысціянскі адказ на злачынствы рэжыму.

На ксяндза была заведзеная крымінальная справа, за якую яму пагражалі дзесяць гадоў турмы. Падчасператрусу ў яго ным доме была «знойдзена» зброя, што стала падставай для прапагандысцкай кампаніі ў сродках масавай інфармацыі. За ксяндзом сачылі, супраць яго ладзілі правакацыі, дасылалі лісты з пагрозамі. Калі стала зразумела, што ніякія метады ціску не спрацоўваюць, спецслужбы прынялі рашэнне забіць ксяндза Папялушку. Увечары 19 кастрычніка 1984 года яго машыну спынілі каля Торуні два супрацоўнікі Службы бяспекі, пераапранутыя ў форму дарожнай міліцыі. Ксяндза схапілі, звязалі і кінулі з моста ў Віслу. Цела святара-пакутніка было знойдзена ў рацэ толькі праз дзесяць дзён.

**Паводле westki.info**

**МЕРКАВАННЕ**

# НАЗАРБАЕЎ СУПРАЦЬ КУЛЬТУ НАЗАРБАЕВА

**Нурсултан Назарбаеў адмовіўся падпісваць законапраект аб наданні яму тытула Лідэр нацыі. Чаму? Пра гэта журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з казахскім журналістам Азаматам Нуркадзілавым.**



**Даведка**

Ідэя надаць Назарбаеву тытул Лідэр нацыі ўзнікла прыкладна месяц таму, пасля падзей у Кыргызстане. Паводле законапраекта, Назарбаеў і яго бліжэйшыя родзічы атрымлівалі неабмежаваныя гарантыі бяспекі, у тым ліку ў выпадку адстаўкі. Уводзілася крымінальная адказнасць за спробу перашкодзіць працы прэзідэнта. Крамолай мог стаць нават здзек з партрэтаў Назарбаева або яго голасу. Праект быў аднагалосна падтрыманы абедзвюма палатамі казахскага парламента, у складзе якога выключна сябры прэзідэнцкай партыі. Нечакана ў апошні момант сам віноўнік падзей даў законапраекту задні ход. «Удзячны казахам і дэпутатам парламента, якія выступілі з ініцыятывай надаць мне статус Лідэра нацыі. Аднагалоснае прынясце адпаведных законаў я расцэньваю як давер народа. Лічу аднак, што статус лідэра нацыі не трэба замацоўваць якімі-небудзь заканадаўчымі актамі. Маю адмову падпісаць дадзеныя законы прашу правільна зразумець» (Н. Назарбаеў).

***— У чым галоўны матыў падобнага рашэння?***

— Адказ ведае выключна сам Назарбаеў. Нам, простым смяротным, застаецца толькі здагадвацца, што за муха яго ўкусіла. Версій хапае. Кажуць, што прэзідэнту не спадабалася дыскусія вакол законапраекту. Было вельмі шмат спекуляцый, што тытул Лідэра нацыі яму спатрэбіўся, каб сысці ў адстаўку ў наступным годзе і забяспечыць сабе спакойную старасць. Назарбаеў быў вымушаны давodзіць, што нікуды сыходзіць не збіраецца.

Магчыма, Назарбаеву не спадабалася якасць падрыхтоўкі кампаніі. Сапраўды, усё было зроблена занадта хутка, засталося шмат праввых недарэчнасцяў, грамадства не зразумела да канца сутнасці законапраекту. Шмат хто лічыў, што гэта — пачатак ператварэння Казахстану ў манархію.

Яшчэ адна версія: адмовіўшыся ад тытулу, прэзідэнт узяў дыстанцыю ад эліты, якая лабіравала незразумелы законапраект і ў выніку апынулася ў фокусе крытыкі грамадства.

Не выключаю, што на гэты раз Назарбаеў прыслухаўся да міжнароднай думкі: за мяжой папросту не зразумелі падобнай ініцыятывы і паставіліся да яе ў лепшым выпадку іранічна. На кану амбіцыйнае жаданне правесці саміт АБСЕ ў Астане ў дзень нараджэння прэзідэнта. Яму, дарэчы, спаўняецца 70 гадоў. І, зразумела, што на гэтым фоне патрэбна дэманстрацыя не толькі «народнай любові», але і прыроджанай сціпласці Назарбаева, яго працідзеяння культу асобы.

У любым выпадку, важна зразумець, што ініцыятарам закона з самага пачатку быў прэзідэнт. Без яго санкцыі нашы дэпутаты нічога не робяць.

***— А як паводзілі сябе самі ініцыятары праекту пасля таго, як прэзідэнт вырашыў не ўпісваць у свае рэгаліі тытул Лідэра нацыі?***

— Склалася камедыйная сітуацыя. Як вядома, на першапачатковай стадыі дыскусіі ініцыятары праекту дзвюма рукамі даводзілі неабходнасць такога закону. Нават спасылаліся на тое, што ў нейкіх аулах Назарбаева даўно называюць не інакш як Лідэр нацыі. Казалі пра тое, што сотні працоўных калектываў літаральна патрабуюць такога заканадаўчага акту. Цяпер ініцыятары кампаніі вымушаны думаць, як захаваць твар. У пятніцу, 4 чэрвеня, абедзве палаты парламента правялі пасяджэнні па гэтаму пытанню і пастанавілі, што «з разуменнем паставіліся да інфармацыі, што Нурсултан Назарбаеў адмовіўся падпісваць закон аб Лідэры нацыі».

У той жа дзень прэзідэнцкая партыя «Нур Атан» распаўсюдзіла каментар намесніка старшыні партыі. «Нягледзячы на тое, што Нурсултан Назарбаеў не падпісаў закон «Пра Лідэра нацыі», ён застаецца нацыянальным лідэрам. З прозвішчам першага прэзідэнта казахскі народ звязвае ўсе свае мінулыя, сённяшнія і будучыя перамогі незалежнага Казахстана, таму Нурсултан Абішавіч Назарбаеў у грамадскай свядомасці даўно ўжо прызнаны», — гаворыцца ў заяве.

Аднак гэта падобна на дрэнную імправізацыю. Маральны крызіс цяперашняй мадэлі казахскага парламентарызму, безумоўна, адзін з галоўных вынікаў гісторыі з Лідэрам нацыі. Дэпутаты спачатку са скуры лезлі, каб у чарговы раз выказаць сваю лаяльнасць да прэзідэнта. Яны былі гатовыя перайсці праз элементарныя паняцці разумнага сэнсу, а цяпер іх заносіць у іншы бок. Як сказаў адзін са слуг народа, «прэзідэнт, калі адмовіўся ад падпісання закону, чытаў нашы думкі». Пытанне: а чаму яшчэ ўчора вы прасоўвалі так заўзята тэму лідэра? Няўжо схадзячы з апазіцыйных настрояў?

***— Як рэагавала на навіну апазіцыя, якая з самага пачатку выступала супраць?***

— Сацыял-дэмакраты віталі рашэнне Назарбаева. Лідэр радыкальнай незарэгістраванай апазіцыйнай партыі «Алга» Уладзімір Казлоў лічыць: «Улічваючы, што парламент складаецца з сяброў партыі прэзідэнта, яго аўтарытэт падарваны такімі паводзінамі яго ж кішэннага парламента, а таксама тым, што за такія паводзіны сваіх падданых прэзідэнт ім яшчэ і падзякаваў. Адзіная магчымасць ачысціць свой аўтарытэт ад гэтага бруду — прыняць рашэнне пра роспуск такога парламента яшчэ да пачатку парламенцкіх вакацый».

У сваю чаргу, камуністы трактуюць паводзіны Назарбаева як палітычную гульню. Варта згадаць, што не так даўно ўсё той жа парламент захацеў назваць сталіцу Астану — Нурсултан. Тады Назарбаеў таксама, як і зараз, выступіў супраць, прадэманстраваўшы сваю высакароднасць. Не кажучы пра тое, што палепшыў свой міжнародны імідж.

***— Ці значыць рашэнне Назарбаева, што больш тэма Лідэра нацыі не ўзнікне?***

— Наўрад ці. Хутчэй за ўсё, праз некаторы час канцэпцыя ўсплыве зноў, аднак на гэты раз пад іншай назвай. Захаваецца стратэгічная ўстаноўка. Гэта нават у заяве прэзідэнта лёгка прачытваецца: «Лічу, што статус лідэра нацыі не трэба замацоўваць нейкімі заканадаўчымі актамі». Акрамя таго, дасюль не зразумела: ці прэзідэнт наклаў вета на праект, ці папросту заявіў, што не будзе нічога падпісваць. У апошнім варыянце гэта значыць, што закон аўтаматычна ўступае ў сілу.

ГЕАПАЛІТЫКА

# КУРДЫСТАН: ЗНОЎ ВАЙНА

Алег НОВІКАЎ

**Праз год перамір'я Курдская працоўная партыя (РКК) зноў пачынае вайну за незалежнасць Курдыстану.**






Мір з туркамі працягваўся 13 месяцаў. Менавіта столькі курдскія нацыяналісты з РКК знаходзілася ў стане аднабаковага перамі'я. Аднак цяпер курды зноў гатовыя ваяваць. «Насуперак дадзеным абяцанням, турэцкі ўрад працягвае спробы знішчыць курдскі рух. Менавіта Анкара нясе адказнасць за новы віток ваеннай трагедыі і яе наступствы», — гаворыцца ў заяве кіраўніцтва партыі. Гаворка вядзецца перш за ўсё пра авіяцыйныя налёты на базы партызан ва Усходняй Турцыі і на поўначы Іраку.

Такім чынам, курдскі супраціў, які цягнецца з канца 1970-х, пачынаецца зноў. Карані РКК звязаныя з групай курдскіх студэнтаў, якія ў 1970 годзе стварылі гурток ва універсітэце Анкары. Яго лідэрам быў Абдула Аджалан. Замест таго, каб па заканчэнню вучобы працаваць, студэнты вырашылі падацца ў родныя мясціны і заснаваць там партызанскія вайсковыя адзінкі. Група хутка праславілася дзякуючы замаху на аднаго з курдскіх правадыроў, які супрацоўнічаў з туркамі.

Сапраўдным падарункам для РКК стаў ваенны пераварот у Турцыі 1980 года. Забарона хоць нейкай палітычнай дзейнасці прывяла ў іх шэрагі шмат людзей. Хутка Сірыя дазволіла РКК арганізоўваць на сваёй тэрыторыі трэніровачныя базы. Дамаск нават заплюшчыў вочы на тое, што Курдыстан, за які змагалася РКК, збіраўся ўключыць частку сірыйскіх зямель.

У 1984 годзе падрыхтаваныя баевікі пачалі пераходзіць сірыйска-турэцкую мяжу і здзяйсняць вайсковыя акцыі. Цікава, што ім на гэтым этапе дапамагалі турэцкія камуністы і нават дэмакраты. Апошнія былі пераканаными, што любая барацьба супраць дыктатуры з'яўляецца прагрэсіўнай.

Напрыканцы 1990-х гадоў групоўка лічылася амаль разбітай. Арышт яе лідэра Аджалана выклікаў спрэчкі ў кіраўніцтве. Акрамя таго быў відавочны ідэйны крызіс: адпаведна статуту і праграме РКК змагалася за сацыялістычны Курдыстан, што на фоне калапсу камуністычнага блоку гучала дастаткова экзатычна.

Аднак арганізацыя выжыла. Як не дзіўна, выжыць ёй дапамаглі амерыканцы, якія скінулі Садама Хусейна. У выніку інтэрвенцыі на поўначы Ірака ўзнікла курдская аўтаномія, дзе РКК лёгка знаходзіць падтрымку і набірае кадры. Хаця якні прымусілі кіраўніцтва аўтаноміі абяцаць не падтрымліваць паўстанцаў, яны дасюль адчуваюць сябе ў тых краях дастаткова ўтульна. Паралельна была вырашана праблема пераемніка Аджалана. Мурат Караілан здолеў падпарадкаваць сабе ўсіх палявых камандзіраў.

У прынцыпе, апошняя заява РКК пра аднаўленне вайсковых дзеянняў — гэта канстатацыя факту. На самай справе, вайна і так працягвалася. Калі верыць тым жа курдскім крыніцам, за апошнія дні баевікі РКК забілі 40 турэцкіх салдат. Апошняя аперацыя — ракетны абстрэл марской базы ў Іскандэруне, падчас якога было забіта сем чалавек. Адначасова паўстанцы прызнаюць, што туркі таксама нанеслі ім цяжкія страты.

Галоўнай прычынай пачаць партызанку стаў загад Аджалана, які зараз сядзіць у турэцкай турме. Як піша прэса, праз свайго адваката ён перадаў інструкцыю для саратнікаў — адкапаць сякеру вайны.

Апошняе перамір'е было абвешчана ў красавіку мінулага года. Камандзіры паўстанцаў нават не хавалі, што яго мэта — забеспячэнне атмасферы для правядзення мясцовых выбараў. Як і прагназавалася, у курдскіх раёнах на выбарах перамагла Партыя за дэмакратычнае грамадства (DTP) — адзіная легальная курдская партыя ў краіне.

Лідэры РКК лічылі, што прысутнасць у мясцовых саветах дэпутатаў-курдаў будзе спрыяць вырашэнню курдскага пытання. Сапраўды, на той момант існавала ілюзія таго, што Анкара гатовая пайсці курдам насустрач. Упершыню ў гісторыі Турцыі ўлады дазволілі выкладанне на курдскай мове. З'явіўся асобны курдскі канал тэлебачання. Турэцкі прэм'ер-міністр Эрдаган казаў пра неабходнасць «адкрыць Курдыстан з дапамогай дэмакратычных рэформаў». Аднак палітычная адліга закончылася вельмі хутка. У снежні па Турцыі пракаціліся масавыя арышты курдскіх актывістаў. У выніку аперацыі было арыштавана прыкладна 1500 падазраваных у кантактах з РКК. Адначасова была забаронена DTP. Апошняя зачыстка мела месца тыдзень таму. За кратамі аказаліся каля 200 чалавек, галоўным чынам студэнты.

Наўрад ці новы віток супрацьстаяння паміж РКК і Турцыяй нешта зменіць у раскладзе сілаў. Відавочна, што курды не маюць адпаведных рэсурсаў, каб выселіць турэцкія вайсковыя часткі з краю.

Аднак эксперты раяць быць асцярожнымі. РКК так ці інакш ёсць фактам дэстабілізацыі ў і без таго напружаным рэгіёне Блізкага Усходу. Акрамя таго, пасля краху СССР ідэалогія РКК імкліва эвалюцыянавала. Спачатку РКК перайшла на пазіцыі нацыяналізму, а цяпер у яе заявах і камюніке ўсё часцей гучаць ісламісцкія матывы.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### ГЕОРГІЙ ПЫРВАНАЎ

Прэзідэнт Балгарыі можа пакінуць сваю пасаду з-за… барана. Праўда, баран не просты, а горны, і называецца архар. Жыве ён ва Узбекістане ў запаведніку і належыць да вельмі рэдкіх жывёл. Узбекскія незалежныя медыя сцвярджаюць, што падчас свайго сакавіцкага візіту да ўзбекаў Пырванаў забіў архара. Грамадскасць Балгарыі адразу адрэагавала на публікацыі пра паляванне Пырванава. У групу «Прэзідэнт — браканьер!» на папулярным сайце вэб-супольнасці Facebook за некалькі дзён запісалася больш за шэсцьсот чалавек, а кааліцыя балгарскіх няўрадавых прыродаахоўных арганізацый «Save Bulgarian Nature» пачала збор подпісаў пад петыцыяй да прэзідэнта. Сам Пырванаў кажа, што барана не забіваў. У адным са сваіх інтэрв'ю ён нават заявіў, што гатовы пайсці ў адстаўку, калі журналісты дакажуць яго дачыненне да забойства архара. Цікава, што афіцыйны Ташкент маўчыць і не ўмешваецца ў сварку балгарскага прэзідэнта з журналістамі і грамадзянскімі актывістамі. Застаецца дадаць, што жыхары аула, куды прэзідэнт Балгарыі прыязджаў папаляваць на архара, такога ажыятажу не разумеюць і нават ганарацца візітам такога высокага замежнага госця.

### УДА ФОЙГТ



Старшыня нямецкай Нацыянальна-дэмакратычнай партыі (NDP) сцвярджае, што яму амаль удалося аб'яднаць усіх неанацыстаў ФРГ пад дахам адной палітычнай сілы, якая, па словах таго ж Уда, хутка стане «самай імперскай партыяй у Германіі». Амбіцыйная заява была зробленая падчас партыйнага з'езду NDP у горадзе Бамберг. Словы Уда пацвердзіў Матыяс Фауст, старшыня Нямецкага народнага саюзу (DVU), які прыехаў на партыйнае мерапрыемства ў якасці госця. Аналітыкі кажуць, што пра раўнапраўнае аб'яднанне ў любым выпадку казаць нельга. DVU знаходзіцца ў стадыі развалу — колькасць сяброў партыі зменшылася з 25 тысяч да 4,5 за апошнія пяць год. Акрамя таго ёсць яшчэ адна праблема на шляху новай структуры. Калі такая партыя будзе створаная, яна павінна несці адказнасць за доўг DVU, які цяпер складае 900 тысяч еўра. Таксама не выключана, што некаторыя сябры DVU не пойдуць на такі сцэнар. Прынамсі арганізацыя DVU у Ніжняй Саксоніі ўжо раскрытыкавала ідэі Уда. Праект толькі пачаўся, а неанацысты ўжо пасварыліся з-за назвы будучай «адзінай» партыі. Адны кажуць, што лепшыя назва — «Сацыяльная айчынная партыя», другія прапануюць назваць партыю «За сям'ю, народ і радзіму».

### КАРЛ ШВАРЦЭНБЕРГ



За былога дырэктара чэшскага МЗС, галоўнага прадстаўніка арыстакратычнага дому Шверцэнбергераў і лідэра партыі «Tradice Odpovmdnost Prosperita 09» («TOP 09») прагаласавалі 16 працэнтаў выбаршчыкаў. У далёкім 1947 годзе пасля прыходу Саветаў сям'я Шварцэнберг збегла з Чэхаславакіі, дзе валодала 11 замкамі і 30 тысячамі гектараў зямлі. У эміграцыі Шварцэнберг актыўна выступаў у падтрымку дысідэнтаў у Чэхаславакіі. Пасля краху камунізму ён быў прызначаны кіраўніком канцылярыі прэзідэнта Вацлава Гавела. Пасля быў сенатарам і выдаваў папулярнага ліберальнага часопіс «Respekt». У 2007 годзе, нягледзячы на адсутнасць чэшскага паспарту, Карл Шварцэнберг з ініцыятывы дэпутатаў ад партыі «Зялёных» стаў адказным за чэшскую замежную палітыку. З таго часу ён з'яўляецца самым папулярным палітыкам у краіне, хаця дасюль яго абвінавачваюць у незаконнай прыватызацыі славутага брэнду алкагольнага напою «Becherovka». Падчас палітычнага крызісу ў 2009 годзе Шварцэнберг стварыў сваю партыю «TOP 90», якая на мінулым тыдні па выніках парламенцкіх выбараў прайшла ў парламент. Ужо вядома, што «TOP 09» будзе сябрам новага кабінету, куды таксама ўвайшлі грамадзянскія лібералы і правыя.

З НАГОДЫ

# БЕЛАРУСІСТЫКА ПРАЗ 20 ГАДОЎ

**Напрыканцы мая ў Мінску прайшоў V Міжнародны кангрэс беларусістаў. Падзея незаўважная для абывацеля, але значная для навуковых колаў Беларусі і замежжа. З аднаго боку, гэта быў кангрэс, прысвечаны беларусазнаўчым пытанням у галіне мовазнаўства, культуры, гісторыі. Апроч таго, быў праведзены справаздачна-выбарчы сход і пераабраны старшыня. З дня заснавання Міжнародную асацыяцыю беларусістаў узначальваў прафесар Адам Мальдзіс. На V кангрэсе старшынёй асацыяцыі быў абраны акадэмік Міхаіл Касцюк. Пра дасягненні і задачы беларусістыкі з імі размаўляла Вольга Хвоін.**




## Міхаіл Касцюк: Прыярытэт — рэстытуцыя



### Даведка

Міхаіл Паўлавіч Касцюк — гісторык паводле адукацыі, каля дванаццаці гадоў працаваў дырэктарам Інстытута гісторыі Нацыянальная Акадэміі навук Беларусі. Але ў 1999 годзе быў вызвалены з пасады з прычыны асабістага канфлікту Міхаіла Касцюка і Аляксандра Вайтовіча, які на той час узначальваў Акадэмію навук і не ўпадабаў навуковую пазіцыю дырэктара інстытута.

— Можна сказаць, што для мяне гэты абавязак нечаканы. Былі просьбы дапамагчы ў працы асацыяцыі, вяліся размовы пра тое, каб узначаліць яе. Але я не думаў, што так атрымаецца ў выніку.

***— Што было зроблена вашымі папярэднікамі?***

— Натуральна, праца не зводзіцца толькі да правядзення кангрэсаў беларусістаў. Фактычна ўсе два дзесяткі гадоў, што існуе асацыяцыя, яна працавала даволі актыўна, найперш у напрамку выдавецкай дзейнасці. Выйшла прыкладна 70 выданняў, думаю, што гэта значны вынік. У навуковых колах гэта добра ацэньваецца, як у Беларусі, так і за яе межамі. Асацыяцыя падтрымлівае сталыя сувязі з навукоўцамі з іншых краін, то бок пераважае навуковы напрамак.

Найбольш актыўна працуюць нашы калегі-беларусісты ў Расіі — у Маскве і Санкт-Пецярбургу, ва Украіне. Нямала ў гэтых адносінах робіць і нашы калегі ў Польшчы. У больш далёкім замежжы можна вылучаць беларусістаў Германіі, Нарвегіі, Англіі. Актыўныя ўдзельнікі гэтага руху маюцца прыкладна ў дваццаці краінах свету. І гэта не столькі прадстаўнікі беларускай дыяспары, колькі замежнікі. Часта цікаўнасць да Беларусі абумоўленая тым, што чалавек мае тут нейкія родныя сувязі, яго продкі паходзілі з гэтых земляў. І гэтыя людзі шчыра зацікаўленыя ў развіцці беларускай культуры.

***— Вы заступілі на новую пасаду і, канешне, мусіце мець уяўленне пра тое, у якім кірунку будзе развівацца асацыяцыя. На што будзеце рабіць акцэнт?***

— Пасля кангрэса, хаця прайшло і нямнога часу, мы правялі першае пасяджэнне беларускай часткі новаабранага камітэта. Было вызначана, што адным з прыярытэтаў дзейнасці мусіць быць рэстытуцыя — гэта значыць усё, што звязана з вяртаннем на Беларусь яе духоўных каштоўнасцяў, якія па тых ці іншых прычынах аказаліся па-за межамі краіны. Мы разумеем, што гэта няпростая справа, нешта было зроблена за час суверэнітэту Беларусі, маюцца рэестравыя спісы.

Але мы паспрабуем вызначыць найбольш важныя пункты ў гэтым рэчышчы з гледзішча дзяржавы, культуры. Каб канкрэтызаваць, хацеў бы згадаць бібліятэку Храптовічаў, яна фарміравалася прадстаўнікамі гэтага роду, а пасля была вывезеная за межы Беларусі. Значная яе частка знаходзіцца ва Украіне. Канешне, гэтая справа няпростая: трэба выходзіць на дзяржаўныя органы, мець абгрунтаванне, чаму той ці іншы прадмет варта вярнуць. Але, наколькі мне вядома, дзяржаўныя структуры Беларусі зацікаўленыя ў гэтым не менш за нас, таму мы спадзяемся на супрацоўніцтва з імі.

Мяркую, што напрамкі дзейнасці трэба пашыраць, каб за межамі Беларусі лепш прадставіць наша мастацтва і культуру ўвогуле. Канешне, на адным пасяджэнні камітэта немагчыма распрацаваць усё да драбніц. Але зразумела, што застанецца ў прыярытэтах пашырэнне сувязяў з актыўнымі людзьмі, якія ўваходзяць у Міжнародную асацыяцыю беларусістаў. Натуральна, мы зацікаўленыя, каб яны прапагандавалі беларускую культуру. З майго пункту гледзішча, нашу асацыяцыю можна разглядаць як форму народнай дыпламатыі за мяжой, але важна, каб гэты рух прысутнічаў і тут, каб пашыраліся шэрагі беларусістаў у абласных цэнтрах.

***— Ці спрыяльныя ўмовы для вашай дзейнасці ў Беларусі?***

— Стан беларускай мовы і культуры агульнавядомы. Канешне, перыядычна паўстае моўнае пытанне. Але думаю, што пэўнае паразуменне мы знаходзім і ў дзяржаўных органах, там таксама ёсць людзі, якія мову і ведаюць, і паважна да яе ставяцца. У навуковых адносінах беларуская мова распрацаваная дасканала, і па гэтых крытэрах знаходзіцца ў першых пазіцыях з шэрагу славянскіх моваў. Мова — душа культуры, гэта ўплывае і на агульны стан культуры Беларусі. Калі бываю за мяжой, то найперш калегі цікавяцца развіццём нашага грамадства з адметнасцямі карэннай нацыі. Мяркую, што гэта нават наш выйгрышны момант у міжнародных стасунках.

Думаю, не памылюся, калі скажу за ўсіх гуманітарыяў: за апошнія 20 гадоў мы насамрэч узбагаціліся ў гуманітарным плане. Напрыклад, гісторыкі вярнулі шмат імёнаў, іншая справа, што нямала ў нас і постацей, якія па тых ці іншых прычынах працавалі па-за межамі Беларусі.

***— Ці былі падчас працы Кангрэсу беларусістаў нейкія складанасці?***

— Заснавальнікамі Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў з'яўляюцца МЗС, НАН Беларусі, Міністэрства культуры, Мінадукацыі. Першыя тры арганізацыі прынялі даволі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы кангрэсу. Перад прысутнымі выступілі прадстаўнікі міністэрстваў культуры і замежных спраў, яны дэкларавалі гатоўнасць да супрацоўніцтва. Удзел Міністэрства адукацыі быў меншым, яны дапамагалі некаторымі кантактамі. Шчыра кажучы, мы спадзяваліся, што будзе большы ўдзел Міністэрства адукацыі. Яго кіруючыя работнікі ў кангрэсе не ўдзельнічалі, але што тычыцца самой сістэмы, то яна была прадстаўленая супрацоўнікамі розных універсітэтаў.

## Адам Мальдзіс: Культура мусіць бегчы паперадзе ўсяго



### Даведка

Адам Мальдзіс — доктар філалагічных навук, прафесар. Сябра Беларускага ПЭН-цэнтра. Сябра Саюза пісьменнікаў СССР. Адзін з заснавальнікаў Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, яе ганаровы старшыня. Аўтар шэрагу манаграфій і кніг.

Скончыў аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны і іншымі медалямі, чатырма польскімі ганаровымі адзнакамі. Перакладае з польскай і балгарскай моваў.

Правядзенне V Міжнароднага кангрэса беларусістаў моцна падтрымалі Міністэрства культуры, Міністэрства замежных спраў, Акадэмія навук Беларусі. І абсалютна абмежавалася ад нас Міністэрства адукацыі, хаця яно і з'яўляецца адным з заснавальнікаў Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў. Я не ведаю, чым гэта можна абгрунтаваць лагічна. Нашы пасяджэнні планаваліся на філфаку, але давялося ладзіць сустрэчы ў харэаграфічнай вучэльні. Частка дэлегатаў з усмешкай гэта ўспрыняла, хоць нас і гасцінна сустрэлі ў гэтай установе, але ўсё ж было нядобрае адчуванне.

Да кангрэсу выйшла некалькі выданняў. Адно з іх з дапамогай швейцарца Поля Сутэра. Ён — банкаўскі работнік, але захапіўся гісторыя беларускіх татараў. І дамогся выдання некалькіх кніг. Можна прывесці многа прыкладаў падобнай цікаўнасці да Беларусі, якая падаецца нават незвычайнай.

Думаю, што такая садружнасць навукоўцаў сапраўды патрэбная, каб прасоўваць беларускую культуру па свеце. У нас дзіўнае ўяўленне, што найперш важная эканоміка. Але калі чалавек не ўспрымае эмацыйна Беларусь, то ён не будзе надта зацікаўлены ў супрацоўніцтве. Калі гаварыць шаблонам, то культура мусіць бегчы паперадзе ўсяго. Гэта ўласна і ёсць наша галоўная мэта — пашыраць прысутнасць Беларусі ў свеце, каб ведалі, што ёсць такая краіна і што дала яна многа выбітных асобаў. Зараз мы рыхтуем другое выданне пра выбітных беларусаў у памежных краінах — наша краіна заўсёды ў гэтым плане была донарам для суседзяў.

Што тычыцца рэстытуцыі, якой плануе займацца асацыяцыя, то я бачу яе і ў прамым, і ў пераносным сэнсе. Не заўсёды магчыма вярнуць страчаныя каштоўнасці, дык трэба, каб хаця б былі добрыя копіі, каб ладзіліся іх выставы. Але неаднойчы былі выпадкі, калі нехта з беларускіх навукоўцаў прыязджае, а да яго ставяцца насцярожана, бо хоча сваё вярнуць. Маю калегу ў Саратаве не пусцілі ў запаснікі музею, свае ж навукоўцы не выклікаюць такой алергіі. У нас пры Саўміне дзейнічае камісія, якая займаецца вяртаннем страчанай спадчыны. Лічу, што гэта вельмі добра, бо любое пытанне вырашаецца хутчэй, калі задзейнічаныя дзяржаўныя, грамадскія і навуковыя структуры.

У такіх няпростых эканамічных ды іншых абставінах захаваць асацыяцыю амаль без стратаў — добры вынік працы. Мяне вельмі парадавала, што на апошні кангрэс беларусістаў прыйшло многа моладзі, разумнай і без комплексаў. Асабіста я ўскладваю вялікія спадзяванні на новага старшыню, бо ён вельмі ўраўнаважаны, дасведчаны чалавек. Пастараемся падабраць людзей, якія будуць яму дапамагаць.

РАЗВАЖАННІ

# ФАЛЬКЛОР І ФОЛК-МУЗЫКА: КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЯ ДРАМА

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**Аднойчы вядомы беларускі рок-музыкант і фальклярыст Юрый Выдронак у інтэрв'ю са скрухай адзначаў: «Нацыянальны фальклор памірае разам са сваімі носьбітамі». І спаслаўся на ўласны сумны досвед: «Напрыклад, многіх унікальных народных спявачак, якія працавалі са мной над запісам першага альбому «Весначуха» гурта «UR'IA», ужо няма ў жывых. Добра, што яны паўдзельнічалі ў маёй працы і іх голас зафіксаваны для будучых слухачоў. А колькі народных талентаў не трапляе ў поле зроку фальклярыстаў? А гэта ж сапраўды нацыянальны культурны генафонд».**

## На мяжы знікнення

Гэтыя словы сугучныя з думкамі еўрапейскіх этнамузыколагаў, якія небеспадстаўна сцвярджаюць, што ў многіх краінах Еўропы традыцыйны фальклор знаходзіцца на мяжы знікнення. Гэтая культуралагічная катастрофа тлумачацца працэсамі глабалізацыі, змяненнем традыцыйнага ўкладу жыцця вясковых жыхароў, які ўсё больш становіцца ў залежнасць ад урбаністычных працэсаў сучаснасці.

Разумеючы сваю адказнасць перад гісторыяй і культурай сваіх народаў, урады многіх еўрапейскіх краін шмат робіць, каб адрадзіць фальклор у яго аўтэнтычным выглядзе і ў натуральным асяроддзі. Для гэтага засноўваюцца дзяржаўныя праграмы падтрымкі аўтэнтычнага фальклору і адпаведнага ладу жыцця яго носьбітаў — сельскіх жыхароў, ствараюцца няўрадавыя спецыялізаваныя фонды для арганізацыі даследаванняў, ладзяцца экспедыцыі і фіксаванне іх вынікаў.

У нашай краіне справа падтрымкі традыцыйнага фальклору знаходзіцца ў вельмі нетыповым для Еўропы стане. Па-першае, дзяржава амаль не клапоціцца пра захаванне нацыянальных музычных і песенных скарбаў. Чыноўнікі гэта тлумачаць крызісным станам эканомікі, а таксама больш пільнымі патрэбамі самой дзяржавы.

Такая «стратэгія» вядзе да таго, што сапраўдны фальклор у нашай краіне альбо незваротна знікае са разам сваімі носьбітамі, альбо трансфармуецца ў сваю супрацьлегласць, такога кшталту:

***Слышу шагі там раздаюцца,***
***Наверна мілый мой ідёт.***
***Но он савсем другую, другую***
***Девушку ведет...***
***Вазьму наган***
***У сваё рукі.***
***Пайду ў садочак я гуляць.***



«Палац»

***А там в зялёненькам садочку***
***закончу сваю я любоў.***
**(З CD «Вясковая лірыка», выданне А. Вележ)**

Зразумела, што такая «народная творчасць» забівае спеўную душу народа, стварае падставы для падмены фальклору з яго паэтыкай і сакральнасцю квазі-варыянтам, які ўжо апанаваў многіх вясковых самадзейных выканаўцаў і стаў візітоўкай дзяржаўных «Дажынак» і «Славянскага базару».

## Фолк-мадэрн

Разумеючы згубнасць такой сітуацыі, шматлікія беларускія незалежныя музыканты спрабуюць узяць на сябе адказнасць за захаванне нацыянальнага фальклору ў сучасных умовах. Тым больш, што ў найноўшай гісторыі Беларусі быў прэцэдэнт, калі прафесійныя выканаўцы ажыццявілі сапраўдную рэвалюцыю ў адносінах да нацыянальнага фальклору. Маю на ўвазе легендарных «Песняроў», якія ў пачатку сваёй творчай кар'еры фальклорнымі апрацоўкамі зрабілі неацэнны ўнёсак у справу папулярызацыі і захавання спеўнай творчасці нашага народа.

Гэта было архіскладана, бо стварыць новую сітуацыю ў адносінах да нацыянальнага фальклору «Песнярам» давялося ў асяроддзі саветызаванага і русіфікаванага гарадскога насельніцтва БССР. Але вынікі іх музычных эксперыментаў былі такія значныя, што беларуская народная песня ў аранжыроўках Уладзіміра Мулявіна стала агульнапрызнанай і ўзорнай у адносінах да фальклорнай спадчыны на прасторах усяго СССР. Мо таму і да сёння «Песняры» лічацца пачынальнікамі цэлага напрамку ў беларускай сучаснай музыцы — фолк-року ці, па актуальнай тэрміналогіі, фолк-мадэрну.

«Песняроўскія» фальклорныя традыцыі таленавіта працягваюць у сваёй творчасці гурты «другой хвалі» айчыннага фолк-мадэрну — «Палац», «UR'IA», «Kriwi», «WZ-orkiestra», «Altanka», «Pete Paff», «OSIMIRA», дуэт Аляксандра і Канстанцін, якія сталі для беларускіх слухачоў узорамі ў творчым падыходзе да беларускага фальклору ўзору XXI стагоддзя. Да таго ж, нельга не браць на ўвагу ўклад у беларускую фолк-скарбонку і такога гурта этнічнага кірунку, як этна-трыо «Троіца», у музыцы якога гарманічна спалучаюцца беларускія народныя мелодыі і стылістка world-music з элементамі музычнай культуры і інструментарыя народаў свету.

## Новая хваля

І тут можна казаць, што напрацоўкі вядучых фолк-мадэрн-калектываў становяцца крыніцай натхнення для пошукаў маладых выканаўцаў. Упэўнены, што беларускія слухачы ў хуткім часе пачуюць імёны выканаўцаў і назвы гуртоў «AKANA-NHS», «Дзівасіл», «Гаротніца».

Чаму ж беларускія выканаўцы ўвесь час звяртаюцца да нацыянальнага фальклору? Можа таму, што выконваць апрацоўкі народных песень — справа модная, выгадная: тут табе і запрашэнні на фестывалі, і выступленні на тэлебачанні, і нават на «Славянскім базары»? Але беларускія рок-музыканты маюць свой погляд на згаданую праблематыку. Напрыклад, лідэр фолк-рок-гурта «OSIMIRA» Андрэй Палаўчэня, які ў адным з інтэрв'ю сцвярджае: «Мода тут не пры чым. Мы сур'ёзна вывучаем беларускую культуру, архаічныя музычныя пласты, старажытныя музычныя інструменты, што дапамагае нам разбудзіць наш нацыянальны музычны генатып».

## З народных крыніц

Зрэшты, і ўвесь беларускі рокрух творча сілкуецца з народных меладычных крыніц, і, наадварот, дадае да фальклорных здабыткаў мінулага свае музычныя фарбы. Гэта дае музыкантам права называцца рухам, які стварае нацыянальны фальклор сучаснасці.

Мо таму з такой удзячнасцю ўспамінае пра народных творцаў лідэр pagan-metal-гурта «Znich» Алесь Таболіч: «Наш новы альбом «Запаветы апошняга старца» — напамін продкаў нам, сучаснаму ўрбанізаванаму пакаленню, пра тыя скарбы, што мы атрымалі ад нашых прашчураў, пра культуру, якую яны пакінулі нам... Гэты альбом прысвечаны, перш за ўсё, вяскоўцам — носьбітам культурных традыцыяў беларусаў, якія захоўваюць народную песню». Такой думкі прытрымліваюцца і іншыя рок-гурты, якія ў сваёй творчасці арыентуюцца на фальклор: «Бан-Жвірба», «UNIA», «Джамбібум» і іншыя.

Разумеючы крытычны стан нацыянальнага фальклору, яго ўплыў на фармаванне нацыянальнага музычнага генатыпу, некаторыя беларускія музыканты імкнуцца нешта зрабіць для яго захавання, папулярызацыі нашай музычнай спадчыны. Першым крокам у гэтай справе можа лічыцца арганізацыя і ўдзел у фальклорных экспедыцыях.

## Скарбы з экспедыцый

Вось што распавядае пра магчымасці прыватна арганізоўваць экспедыцыі адзін з ветэранаў айчыннага фолк-руху Юры Выдронак: «Сапраўды, раней мне часта даводзілася бываць у фальклорных экспедыцыях, фіксаваць вельмі старажытны, нават архаічны матэрыял. Зараз на гэта банальна не хапае сродкаў. У мяне ёсць дастаткова якасная запісваючая апаратура, набытая прафесійная відэакамера, але няма транспарту дзеля таго, каб дабрацца да самых аддаленых беларускіх вёсак. Я ведаю, што не толькі я, але і шмат іншых энтузіястаў здзяйсняюць экспедыцыйныя паездкі, але гэта фрагментарная работа. А патрэбны комплексны падыход. У свой час мы выдалі на магнітафонных касетах і на CD двайны альбом з аўтэнтычнымі запісамі «Каляды. Ражство. Шчодрэц», хоць планавалі выдаць дванаццаць такіх кружэлак...»

У такіх экспедыцыях даволі доўгі час удзельнічалі лідэр этнатрыо «Троіца» Іван Кірчук, а таксама кіраўнік гурта «Ліцьвіны» Уладзімір Бербераў, лідэр гурта «Znich» Алесь Таболіч, удзельнікі студэнцкага этнаграфічнага таварыства. Акрамя згаданага шчадроўскага альбому «UR'IA», экспедыцыйны альбом ёсць у дыскаграфіі Івана Кірчука, які названы «Спадчына загінуўшых вёсак»... Але большасць запісаў, здабытых энтузіястамі падчас вандровак па самых аддаленых мясцінах Беларусі, яшчэ чакае сваіх навуковых рэдактараў і руплівых выдаўцоў.

## Адраджэнне сакральнага сэнсу

Адна з тэндэнцыяў апошняга часу ў айчынным фолк-руху — спробы вяртання айчыннаму фальклору яго сакральнай сутнасці. Калі сказаць прасцей, то зараз многія беларускія выканаўцы фолку не супраць і самі стаць ініцыятарамі адраджэння нацыянальных традыцый у спракавечных умовах іх бытавання.

І не толькі ў атачэнні шэдэўраў Беларускага музея народнай архітэктуры і побыту, як гэта практыкуюць удзельнікі фолк-гуртоў «GUDA» і «Ліцьвіны», але і самі становяцца ўдзельнікамі народных фальклорных святаў у рэгіёнах. Вось напрыклад, гурт «UR'IA» і яго кіраўнік Юрась Выдронак ужо некалькі гадоў запар удзельнічаюць у традыцыйным веснавым абрадзе Юр'я, які адбываецца ў палявых умовах ля адной з вёсак Любанскага раёну.

Музыкі і самі не супраць стварыць прэцэдэнт сакральнага свята, нават у гарадскіх умовах. Апошнім праектам Юрыя і яго ных калег стаў праект «Таўкачыкі» на Дзяды, альбо Halloween па-беларуску». Разынкай свята стала запрашэнне народных спявачак з гурта «Глыбокія крыніцы» вёскі Закальное Любанскага раёна Мінскай вобласці. Народныя пявунні выканалі на сцэне тэатра імя Янкі Купалы абрад Дзядоў у такім выглядзе, як гэта рабілі нашы продкі на працягу сотняў гадоў. Адбывалася гэта ў рэчышчы старажытнай абраднасці: са спевамі, малітвамі да Дзядоў і адпаведным святу антуражам.

Але не толькі аўтэнтычныя выканаўцы запрашаюцца да ўдзелу ў такім свяце. У ім удзельнічаюць і іншыя фолк-выканаўцы — вядомыя гурты «Альтанка», «Дзівасіл», «Нагуаль». Міжнародны статус Дзядоў ад гурта «UR'IA» гэтым разам падтрымалі сваімі «задушнымі» мелодыямі польскія выканаўцы з «Zespola polskiego» — зоркі польскай фолк-сцэны пад кіраўніцтвам знакамітай выканаўцы і педагога Марыі Памяноўскай. І гэта добрая традыцыя правядзення музычных імпрэзаў фолк-фэста «Таўкачыкі».

## Рэцэпт — гармонія

Падводзячы вынікі гэтага невялікага агляду, заўважу, што часцяком спецыялісты, крытыкі і шматлікія аматары спеўнай спадчыны нашага народа задаюць пытанне: што выратуе беларускі фальклор ад цяперашняга крызісу — суперсучасныя апрацоўкі разнастайнымі фолк-гуртамі і іх выкананне на канцэртных пляцоўках, экспедыцыі з запісам перлін нацыянальнага фальклору, якія яшчэ захаваліся, ці, можа, для яго выратавальным стане адраджэнне сакральнага складніку народнай спеўнай спадчыны?

Вопыт беларускіх фолк-выканаўцаў і цвярозае асэнсаванне сённяшніх рэаліяў падказвае: толькі гарманічнае спалучэнне гэтых элементаў працы на фальклорнай дзялянцы дазволіць энтузіястам і выканаўцам фальклору захаваць нацыянальную спадчыну (гэта аптымістычны погляд на працэс) ці хаця б затармазіць працэс размывання нашай спеўнай Атлантыды. Прынамсі да таго часу, калі ў сённяшняй улады зменіцца стаўленне да айчыннай фальклорнай спадчыны. Ці сама ўлада зменіцца на сваю супрацьлегласць у адносінах да беларушчыны.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# CORPUS DOMINI

Алесь ГІНЗБУРГ

**Напрыканцы першага тыдня чэрвеня па ўсёй Беларусі прайшлі ўрачыстасці Найсвяцейшага Цела і Крыві Хрыста, шырэй вядомыя ў народзе як свята Божага Цела. З гэтай нагоды каталіцкія парафіі па ўсёй краіне зладзілі традыцыйныя шэсці, удзел у якіх сёлета толькі ў Мінску ўзялі 12 000 чалавек.**

## Сем вякоў традыцыі

Свята Божага Цела (Corpus Domini) прысвечанае Еўхарыстыі, або Святому Прычасцю — аднаму з самых галоўных хрысціянскіх таемстваў. Паводле евангелістаў, яго ўсталяваў сам Ісус Хрыстос на Таемнай Вячэры. Падчас Прычасця хрысціяне прымаюць Цела і Кроў Ісуса пад выглядам хлеба і віна, і, згодна з вучэннем, праз гэты акт узаемнай ахвярнай любові спалучаюцца непасрэдна з Богам.

Еўхарыстыя — абрад, які прызнаюць усе хрысціянскія канфесіі. Розніца ў яго тлумачэнні. Праваслаўная, каталіцкая, армянская апостальская і некаторыя іншыя дактрыны ў прамым сэнсе атаясамліваюць хлеб і віно з субстанцыяй Ісуса. А вось рэфармаваныя цэрквы ў сваёй большасці асучасніваюць падыход да Прычасця, сцвярджаючы, што хлеб і віно толькі сімвалізуюць Кроў і Цела Ісуса: іх «каштаванне» адбываецца толькі метафарычна, у духоўным плане. Само слова «еўхарыстыя» ў перакладзе з старагрэчаскай азначае «падзяку», бо ўдзел у святой імшы, падчас якой хлеб і віно ператвараюцца ў Цела і Кроў, — гэта, паводле ксяндза Віктара Місевіча, «найлепшая магчымасць падзякаваць Богу за ўсе дары, атрыманыя ад Яго».

Такім чынам, Еўхарыстыя — адзіны, па сутнасці, з усіх важных абрадаў, якім хрысціянства ў шырокім сэнсе адрозніваецца ад іншых рэлігійных плыняў. І менавіта таму, мяркуюць гісторыкі, свята Божага Цела займела такое значэнне ў сярэднявечнай Еўропе, дзе Рымскі Касцёл імкнуўся вылучыць хрысціянскую дактрыну ў супрацьвагу пагрозе мусульманскіх заваёваў.

Свята ўзнікла ў сярэдзіне XIII стагоддзя ў Германіі, і неўзабаве пашырылася на ўсю Заходнюю Еўропу. У 1263 годзе ў італьянскім горадзе Бальсэне адбыўся цуд. Адзін святар, адпраўляючы імшу, засумняваўся ў рэальнай прысутнасці Ісуса ў Еўхарыстыі. У яговых руках з аплаткі пачалі капаць кроплі крыві… Праз год Папа Урбан IV пастанавіў зрабіць гэта свята агульнакаталіцкім, надаўшы яму значэнне свайго культу маніфестацыі супраць «памылковых перакананняў ерэтыкоў». Канчаткова Рым зацвердзіў яго ў пачатку XIV стагоддзя. З таго часу вось ужо семсот гадоў на вуліцы еўрапейскіх гарадоў выходзяць урачыстыя працэсіі.

Свята пастаноўлена адпраўляць роўна праз шэсць тыдняў пасля Вялікага Чацвярга, калі, згодна з Евангеллем, адбылася Таемная Вячэра. Перанос адбыўся для таго, каб радасць вернікаў з нагоды Найсвяцейшага Сакрамэнту (святых дароў Ісуса — хлеба і віна апосталам — і ўсім хрысціянам) не была азмрочаная смуткам ад Укрыжавання Ісуса. Свята Божага Цела — свята радасці, — падкрэслівае Касцёл.

## Гучная малітва

У Беларусі ў наш час, па меры вяртання традыцыі, адбыўся яшчэ адзін перанос. Паколькі шосты чацвер пасля Вялікадня не абвешчаны дзяржаўным выходным, каталікі ладзяць шэсці ў наступныя пасля яго суботу ці нядзелю. У Віцебску ўрачыстасць адбылася сёлета 5 чэрвеня, у Мінску — 6-га. Працэсія Божага Цела зазвычай мае класічнае пастраенне і дзейныя асобы. Святарства ва ўрачыстых залацістых уборах, маленькія дзеці, якія сёлета прынялі першую Камунію (Прычасце), у белых строях, юнакі і дзяўчаты ў беларускіх нацыянальных строях, дужыя мужчыны нясуць трон з Найсвяцейшым Сакрамантам. Парафіяне розных касцёлаў гораду нясуць харугвы. За галавой працэсіі выстройваюцца ўсе вернікі, якія жадаюць далучыцца да радаснага дзейства. Неабходны сучасны атрыбут — мікрафоны, дынамікі і нават перасоўныя трансляцыйныя кропкі. Адна з асаблівасцяў свята Божага Цела — яго падкрэсленай гучнасць, заўважнасць.

Працэсія, паводле традыцыі, павінна прайсці чатыры стацыі, каля якіх ладзяцца набажэнствы. Гэтыя стацыі адначасова сімвалізуюць чатыры бакі свету і чатыры Евангеллі. Так, Мінская працэсія 2010 года выйшла з Касцёла святога Роху, зрабіла тры прыпынкі: перад вечным агнём на плошчы Перамогі, ушанаваўшы памяць ахвяраў другой сусветнай вайны, на Кастрычніцкай плошчы, на плошчы Незалежнасці перад Чырвоным касцёлам і на плошчы Свабоды перад катэдрай Панны Марыі.

Мінская працэсія Божага Цела скончылася малітвай у гонар Найсвяцейшага Сакраманту і спяваннем гімна «Магутны Божа».

АНОНС

# «BE2GETHER»: НАВІГАТАР ПА НАРВІЛІШКАХ

Ева ВАЙТОЎСКАЯ

**Мы ўжо пісалі, што 25–27 чэрвеня на беларуска-літоўскім памежжы фестываль «Be2gether». Цягам трох дзён наведнікаў чакае выступ каля 50 выканаўцаў з усяго свету. Але музыка — далёка не адзінае, чым сёлета вабіць фестываль.**

## Танцы і перформансы

На «Be2gether» упершыню будзе створаная асобная сцэна артперформансаў для прэзентацыі розных культур свету, тэатральных спектакляў і імправізацый, прадстаўленняў мадэрн-мастацтва, у якіх змогуць паўдзельнічаць і самі гледачы.

Таксама гледачы змогуць павучыцца граць на барабанах, паспрабаваць сябе ў мастацтве жангліравання ці акрабатыкі, паўдзельнічаць у спаборніцтвах па вулічных танцах. Ансамбль літоўскай габрэйскай грамады падрыхтуе адмысловы танцавальны выступ ва ўсходнім стылі. Таксама гледачы ўбачаць бразільскае баявое мастацтва — капаэйру, танцавальныя шоу фламенка, сальсы, індыйскага танца. Будзе таксама прэзентавацца праект французскай песні.

## Авангард і архаіка

У Нарвілішках беларускія артысты адчыняць дзверы ў мінулае музыкі і мастацтва. Кампанія «Budzma!» дасць магчымасць удзельнікам фэсту пазнаёміцца з архаічным мастацтвам, слухаючы рытмы танцавальнай музыкі ці гледзячы авангарднае кіно.

Зона «Budzma!» на тэрыторыі «Be2gether» будзе ўяўляць сабою сінтэз са старажытнай вёскі і сучаснага горада, якія суседнічаюць адзін з адным. Старажытная друкарня будзе працаваць цягам усяго фэсту, і ў гасцей з'явіцца магчымасць зрабіць містычныя кудмені, сакральныя лялькі, а таксама пагуляць у архаічныя гульні.

## Антыстрэс

У намёце клуба-бара «Play — Guru» вы займееце магчымасць парэлаксаваць пасля канцэртаў. Тут вы зможаце пагуляць у настольны футбол, навучыцца граць на перкусіі, жангліраваць, майстраваць арыгамі. На ўроках моды «Pats Sau Dizaineris» («Сам сабе дызайнер») вас навучаць таму, як слушна спалучаць вопратку з біжутэрыяй, а кліентам «Pasitikek Kirpeju» («Даверся цырульніку») давядзецца даверыцца фантазіі цырульніка. Пры гэтым у намёце будзе працаваць дзіцячы пакой з цікавосткамі для самых маленькіх удзельнікаў свята.

## Лазня і масаж

На тэрыторыі фестывалю ўсталююць вялікую лазню-парылку, разлічаную на 15–20 чалавек адначасова. У намётах побач прадстаўнікі «Акадэміі лазні» («Pirties akademija») будуць вучыць слушна карыстацца лазневым венікам, раскрываць сакрэты масажу, ароматэрапіі і іншых лазенных прыемнасцяў. Апроч таго, на «Be2gether» будуць працаваць тры масажныя намёты, прычым адзін з іх («East Island») — бясплатны.

## На ўсялякі пажарны

Паводле агучаных у сеціве правілаў «Be2gether», сярод іншых колюча-рэжучых рэчаў на танцпол забаронена праносіць… парасоны. Таму наведнікам рэкамендуецца запасціся дажджавікамі і гумовым абуткам, ультрамодным у гэтым годзе. У тых жа, каму ляніва будзе везці з сабой гэтыя аксесуары, будзе магчымасць набыць іх на тэрыторыі фэсту.

Таксама сярод выгодаў: кухня розных народаў, разліўное піва, доступ у інтэрнэт, прыбіральні і душавыя кабіны.

### ALINA ORLOVA ПРАДСТАВІЦЬ НОВЫ АЛЬБОМ



Зорка літоўскай сцэны Аліна Арлова рыхтуе прэм'еру — гледачы фестывалю «Be2gether» першымі пачуюць песні з яе новага альбому і пабачаць яе новую канцэртную праграму.

На фестываль Аліна Арлова прыедзе разам з гуртом, а суправаджаць іх выступ будуць візуалізацыі мастака Рудольфа Лявуліса. Адмыслова для новага альбома, які патрапіць у продаж у ліпені, на відэа зняты людзі і іх эмоцыі. Па словах спявачкі, менавіта гэтыя рэчы з'яўляюцца найбольш істотнымі ў яе творчасці.

Аліна Арлова (сапраўдное прозвішча — Арлоўская) — 21-гадовая спявачка з Літвы. Спявае на рускай, літоўскай, англійскай мовах. У 2008 годзе прэзентавала дэбютны альбом «Laukinis šuo dingo» (літоўскі каламбур: можна прачытаць як «Дзікі сабака дынга» або як «Дзікі сабака знік»). Новы альбом, рэліз якога запланаваны на восень 2010 года, назвы пакуль не атрымаў. Жанр песняў Арловай крытыкі вызначаюць як «псіхафолк».




**ПАДАЦЬ НА ВІЗЫ МОЖНА ДА 17 ЧЭРВЕНЯ**

Для падачы дакументаў у амбасаду кожны квіток трэба зарэгістраваць на сайце www.b2g.lt. Падрабязная інфармацыя пра візы на сайце b2g.soundline.by.

Квіткі: групавыя (ад 4 асобнікаў) — 185 тыс. руб., для студэнтаў — 200 тыс. руб. (па пасведчанні), для астатніх — 250 тыс. руб. У продажы ў грамадскіх распаўсюднікаў, а таксама праз сістэму TicketPro. Замова квіткоў і даведка па тэлефонах (029) 6 5555 96, (033) 6 5555 96.

Бясплатныя візы выдаюцца толькі па набытых у Беларусі квітках.

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 537
Падпісана да друку 11.06.2010. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.